PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 2 (2487) Год XLIX Беласток, 11 студзеня 2004 г. Цана 2,00 зл.

Мода на „Ніву”

Яўген Вапа

Святочны перыяд спрыяе вяртанню ў свет свайго дзяцінства. Прыпамінаем усю таямнічасць і прыгажосць Калядных свят. І не найважнейшае ва ўсім гэтым было сённяшняе шаленства абдорвання падарункамі. Ад некалькіх гадоў уся радасць Нараджэння Гасподняга гэта перфекцыйна раздзьмутае прадаўцамі мастацтва выцягвання з нашых кішэняў грошай на больш ці менш патрэбныя ў нашым жыцці сувеніры. І адзіная „рэфлексія”, якая асацыюецца з навагоднім перыядам, гэта атакаванне мазгоў у адным напрамку, у жанчын часта спалучанае са станам неўрознасці — чым абдорыць у гэтым годзе, каб не паўтарыліся мінулагоднія прэзенты. Для яснасці, кожны любіць атрымоўваць прэзенты, у тым ліку і ніжэйпадпісаны. Але калі гэта мае быць адзіны сэнс нашай павагі да адной з важнейшых падзеяў у хрысціянскім свеце, дык, выбачайце, нешта тут не так.

Чым бліжэй да святочных дзён, тады як шалёныя бегаюць людзі па крамах з адной неўтаймаванай прагай: купляць, купляць, купляць. Быццам ад колькасці купленых тавараў ці яды залежыць наша збаўленне ці адпушчэнне грахоў. Разумею, што з псіхалагічнага пункту гледжання такім чынам мы кампенсуем тое, чаго не маглі атрымаць у дзяцінстве — прыгожых, вялікіх, каляровых цацак ці цукерак; а таксама невялікі выбар яды, характэрны беднаму побыту беларускай вёскі ці малога мястэчка. А зараз хочам усё гэтае глытануць самі і наўпіхаць яшчэ сваім дзецям і бацькам. Трэба ж аддзячыць за тое, што з'явіліся мы на свеце і змаглі прыдбаць нашчадкаў — прадаўжальнікаў чалавечага роду. І калі мы так моцна чакалі Калядаў (адразу ўспамінаецца прыгожая паэтычная балада пад такім жа загалоўкам у выкананні Касі Камоцкай і „Новага неба”), то змучаныя перадсвяточнай мітуснёй, не маем сілы, каб знайсці час на рэфлексію і звычайныя, сямейныя размовы. Некаторыя, нават ведаю такіх, ужо ў час Куцці думаюць пра тое, каб святы хутчэй закончыліся. Таму дзеля псіхічнага камфорту нясмела прапаную Вашай увазе, шаноўныя чытачы, улічыць як адзін з варыянтаў карысных, штогадовых прэзентаў падпіску сваім блізкім нашага штотыднёвіка — значыць „Нівы”.

Мода на „Ніву”

Мая мама і яе суседкі дасканала арыентуюцца ў амерыканскім тэлесерыяле „Мода на поспех” („Moda na sukces”), якога на экране з'явілася ўжо дзве тысячы серый. Ёсць што каментаваць, ёсць пра што гаварыць у зімовыя вечары. Можна заплакаць над лёсам нешчаслівых каханняў і здрадаў, чакаючы Каляд і чарговых свят. І таксама моцна як свят

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі семінара: (злева) Тамара Васюк, Рыгор Шаўра, Аляксей Пазднякоў, Ян Карпюк, Валянціна Ушакова, Лідзія Малахава, Лада Шчасная і Алла Непачаловіч

Традыцыя і сучаснасць

Аляксей Мароз

Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы і Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры ў Мінску арганізавалі 20 снежня 2003 года навукова-творчы семінар „Традыцыя і сучаснае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва польска-беларускага памежжа”, які адбыўся ў музеі. Дзень раней адбылося адкрыццё выстаўкі сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аўтарамі якога з'яўляюцца студэнты і выкладчыкі Кафедры народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва згаданага універсітэта. Супрацоўніцтва паміж установамі Мінска і Гайнаўкі завязалася год таму. У Беларускім музеі была наладжана тады выстаўка мастацкіх вырабаў прывезеных з мінскага універсітэта.

— У гэтым годзе мы прыехалі з больш пашыранай прапановай супрацоўніцтва і абмеркавання актуальных пытанняў развіцця народнага мастацтва на польска-беларускім памежжы, — заявіў прафесар мастацтвазнаўства Рыгор Шаўра.

Госці з Мінска прывезлі з сабой мастацкія вырабы, выкананыя з выкарыстаннем сучасных і народных матываў. На выстаўцы паказваюць кераміку зробленую старым спосабам паводле сучасных узораў. Ручнікі былі тканы на кроснах, але захаваліся на іх толькі некаторыя даўнія беларускія матывы. На інкрустацыях саломы запыленні фонаў выконваліся нават з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі. Большасць паказаных у Гайнаўцы касцюмаў праектаваныя былі студэнтамі і атрымлівалі ўзнагароды на міжнародных мастацкіх конкурсах у Мінску. Пасярэдзіне выставачнай залы красуецца шыкарны касцюм „Чароўная пані”.

— Гэты касцюм атрымаў Гран-пры на міжнародным конкурсе нацыянальнага касцюма высокай моды, арганізаваным у 2001 годзе ў Маскве. Выканаў ён на падставе касцюма Барбары Радзівіл. Сакрэт нашых поспехаў у тым, што ў аснове нашых работ выкарыстоўваецца традыцыя і яе добрае вывучэнне, — сказаў дэкан Рыгор Шаўра.

Семінар адкрылі і вялі намеснік рэктара Дзяржаўнага універсітэта культуры ў Мінску па справах супрацоўніцтва з замежжам Аляксей Пазднякоў і этнограф з Гайнаўкі Нэля Шчука. Апрача гасцей з Беларусі, прынялі ў ім удзел удзельнікі з Гайнаўкі, Бельска-Падляшскага і Белавежы. Дацэнт Аляксей Пазднякоў расказваў аб працах па захаванні культурнай спадчыны ў Беларусі. Гаварыў ён пра Мірскі замак і паказныя культурныя інвестыцыі, на якія выкладваліся грошы з дзяржаўнага бюджэту. Аднак у бюджэце мала сродкаў на рамонты нішчэючых меншых помнікаў культуры. Дэкан Рыгор Шаўра і выкладчыцы з яго кафедры расказалі пра дзесяцігадовую дзейнасць іх установы і пра мастацкія работы прывезеныя на выстаўку. Ужо каля 200 асоб закончыла вучобу на Кафедры народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Мінску і многія працуюць у сваёй прафесіі. Лідзія Малахава гаварыла аб узаемасувязях народнага мастацтва беларускага памежжа, карыстаючыся матэрыяламі экспедыцый з 2002 і 2003 гадоў. У мінулым годзе выкладчыкі Дзяржаўнага універсітэта культуры ездзілі таксама па вёсках Гайнаўшчыны, збіраючы матэрыял для навуковай работы. Аказваецца, што на памежжы Белару-

[працяг ☞ 2]

Гмінны цэнтр інфармацыі ў Нараўцы

☞ 3

Віцэ-міністр Марэк Шчапанскі сказаў, што цэнтр дапаможа хадайнічаць аб сродкі на развіццё гміны і перасцерагаў работнікаў, каб шукаючы інфармацыю навучыліся адкідаць усялякае інтэрнэтнае смецце. Паводле віцэ-маршалкаа Кароля Тыленды, цэнтр дапаможа прыцягнуць вонкавы капітал для рэалізацыі турыстычных і гандлёвых інвестыцый.

Афрыканскі капіталізм

☞ 4

На рынку праіснавалі толькі такія прадпрымальнікі, якія адкінулі ўсе прынцыпы сучаснага капіталізму. Прапаў бы, напрыклад, кожны, хто захацеў бы прадукаваць каўбасу з мяса, ці масла са сметаны. Купляем усё, што толькі падобнае на малако, хлеб, сыр ці венджаны кумпяк, але плацім як за сапраўдныя прадукты.

Захаваць старую архітэктуру

☞ 4

Сакратар Таварыства аховы краявідаў Анджэй Корбель прапанаваў захаваць старыя дамы ў Гайнаўцы ў якасці атракцыёна для турыстаў. Прадставіў ён фатаграфіі старых будынкаў — сведкаў мінулага Гайнаўкі. Будынкам характэрны аздобы, якія не сустракаюцца ў іншых рэгіёнах Польшчы.

Пленум ГП БГКТ

☞ 5

Пленум прысвечаны быў абмеркаванню дзейнасці БГКТ у летнім сезоне 2003 года, планаў і перспектыў дзейнасці БГКТ на 2004 год, справы беларускай асветы і школьніцтва ды сітуацыі з Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Земляроб з душой мастака

☞ 8

Ад самых ранніх гадоў запалоніў яго багаты свет колераў. Станіслаў Паскробка думаў як затрымаць, увекавечыць той ці іншы міг казачнасці, непаўторнай прыгажосці і гарманічнасці ў прыродзе. Тое, што адыходзіць і больш ніколі не паўтараецца. І ў памяці, быццам у сне, прыходзілі да яго бачаныя пейзажы, жывыя колеры.

Вучацца гаспадарчай дзейнасці

☞ 11

11 і 19 лістапада 2003 года Павятовае староства ў Гайнаўцы праводзіла курсы па прынцыпах карыстання праграмай SAPARD. Грошы з гэтай праграмы можна атрымаць, пасля заканчэння работ, на стварэнне дадатковых крыніц даходаў у сельскай гаспадарцы, месцаў працы па-за сельскай гаспадаркай і інфраструктуры на вясковых тэрыторыях.

Беларусь — беларусы

На выпрабавальным шляху

Чарговы год стаў ужо набыткам гісторыі. Цяпер, відаць, можна дакладна сцвярджаць, што для Беларусі 2003 быў годам акрэслення пэўнай перспектывы. І нягледзячы на тое, што значныя грамадска-палітычныя падзеі насілі з большага негатыўную афарбоўку, на добрую надзею наводзіць матэматычнае правіла — мінус на мінус дае плюс. А мінусаў летась хапала.

У 2003 годзе Беларусь страціла двух найвыбітнейшых сваіх грамадзян — Васіля Быкава і Уладзіміра Мулявіна. Абодва, хоць кожны па-свойму, былі носьбітамі беларушчыны. Той, якую немагчыма сцерці рознымі інтэграцыямі ці незразумелымі ідэалогіямі. Бо яна не заснаваная на палітычнай кан'юнктуры і не залежыць ад асоб, што знаходзяцца на вяршыне дзяржаўнай улады.

Але менавіта ад палітычнай кан'юнктуры і розных сімпатыяў-антыпатыяў залежыць існаванне асяродкаў беларушчыны. Адзін з іх — Беларускі нацыянальны гуманітарны ліцэй — адзіная беларускамоўная навучальная сярэдняя спецыяльная ўстанова аказалася знішчанай. Але яе знішчэнне не стала абазначаць ліквідацыю жадання хлопцаў і дзяўчат, якія адчуваюць сябе беларусамі, атрымліваць адукацыю на роднай мове. І роспуск педагагічнага калектыву не стаўся для настаўнікаў штуршком да дэпрэсіўнай роспачы. Педагогі праводзілі і праводзяць заняткі, хай і ў розных канцах Мінска, на якія ходзяць іх удзячныя навучэнцы. І няхай цяпер заняткі сталі праходзіць у Вільні, ліцэй, які збольшага знаходзіцца ў свядомасці ягоных настаўнікаў і вучняў, усё роўна працягвае жыць.

Сярод асноўных беларускіх палітычных падзей варта вызначыць выбары ў мясцовыя органы ўлады. Зразумела, яны не сталі паваротным пунктам ва ўнутрыпалітычнай сітуацыі, але іх вынікі далі надзею на тое, што дэмакратыя для жыхароў Беларусі гэта не нешта чужое і незразумелае. Дзесяткі дэмакратаў сталі дэпутатамі. Канешне, гэта маленечкая кропля ў шматтысячным моры дэпутатаў ад выканаўчай улады, але, згодна прыказцы, „нельга казаць, што няма лесу, калі ў зямлі ляжыць хаця б адзін жолуд".

Прызнанне беларускай Палаты прадстаўнікоў Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ і распачатае функцыянаванне мінскага офіса гэтай арганізацыі паказалі вельмі сціплы ўплыў Захаду на сітуацыю з дэмакратыяй і правамі чалавека ў краіне. Але ў гэтым ёсць станоўчы бок — цяпер беларускія дэмакраты мусяць у поўнай меры разумець, што разлічваць, у першую чаргу, яны могуць толькі на сябе. Замежныя візіцёры былі і застануцца толькі назіральнікамі і канстататарамі фактаў, але не больш таго. Магчыма, з гэтага і распачалося збліжэнне абсалютна розных ідэйна, але жадаючых гуляць па зразумелых правілах, палітычных партый. Кааліцыя „5+" мае ўсе шанцы перарасці ў шырокі апазіцыйны цяперашняй уладзе рух.

Беларуска-расійскія стасункі цягам 2003 года набывалі ўсё больш супярэчнасцей. Дзякуючы палітычнай кан'юнктуры былы заўзяты інтэгратар з Расіяй А. Лукашэнка стаў ледзьве не самым галоўным яе крытыкам на беларускім абшары. Практычна пахаваная ідэя ўвядзення расійскага рубля ў Беларусі. Размовы аб танным расійскім газе на 2004 год пакуль застаюцца толькі размовамі. Маю падазрэнне, што беларускі бок не пойдзе на саступкі расіянам і не прадасць галоўную „трубу" — канцэрн „Белтрансгаз". Гэта, па вялікім рахунку, не надта пагоршыць эканамічную сітуацыю, бо нават, як сведчаць незалежныя апазіцыйныя эканамісты, аб неабходнасці шырокай прыватызацыі гучна кажуць дырэктары прадпрыемстваў. А яны выдатна разумеюць, што гэты працэс не „за гарамі" і каму як не ім станавіцца асноўнымі трымальнікамі акцый. А значыць, беларускія прадпрыемствы з большага застануцца ў беларускіх руках. Справа з „Белтрансгазам" можа дайсці да таго, што размаўляць аб яго набыцці расійскаму „Газпраму" прыйдзецца не з беларускім урадам, а з некалькімі старшынямі акцыянерных таварыстваў.

Правы і свабоды чалавека па-ранейшаму заставаліся нечым незразумелым лукашэнкаўскаму кіраўніцтву. Закрываліся газеты, арыштоўваліся пікетоўшчыкі, ліквідоўваліся няўрадавыя арганізацыі, узмацніўся ціск на прафсаюзы, невысветленымі засталіся знікненні палітычных апанентаў рэжыму. Але... стваралися новыя прафсаюзы, новыя няўрадавыя арганізацыі, узрасталі дасведчанасць і прафесіяналізм незалежных журналістаў і будучых дзяржаўных дзеячаў. „Праблема зніклых" па-сапраўднаму выйшла на міжнародны ўзровень і гэта дае, па меншай меры, спадзяванне, што апазіцыйныя палітыкі і журналісты больш не будуць таямніча знікаць.

Новы 2004 год будзе годам высакосным. У народзе высакосны год заўсёды лічыцца цяжкім. Наўрад ці 2004 стане выключэннем. Магчыма, ён прынясе большыя выпрабаванні, чым год папярэдні. Але, відаць, мусіць прайсці праз іх Беларусь, беларускі народ, беларушчына. І тады абавязкова прыйдзе годная змена Быкаву і Мулявіну.

Уладзімір Лапцэвіч

Традыцыя і сучаснасць

[1 ☞ працяг]

сі, Польшчы і Літвы ў народным мастацтве многа супольных прыкмет. Тлумачыцца гэта супольнымі традыцыямі, якія сягаюць яшчэ часоў Вялікага княства Літоўскага.

З Польшчы выступілі этнографы Нэля Шчука і Ева Кэчынская-Мароз. Нэля Шчука расказвала пра дэкаратыўна-прыкладную тканіну, а Ева Кэчынская-Мароз аб разьбе ў Белавежскай пушчы і наваколлі. Аказваецца, што ў Белавежскай пушчы і навокал амаль не было народных разьбяроў. Некаторыя майстры вырэзвалі выявы зброў, якіх прадавалі дзеля заробку. Мода на ветранкі і аканіцы з разнымі матывамі была прывезена бежанцамі з Расіі.

— Дзве выстаўкі і семінар з'яўляюцца добрым пачаткам нашага супрацоўніцтва з Гайнаўскім музеем. Спадзяемся, што будзе пашырацца навуковая база музея. Я думаю, што ўзаемапранікненне нашых культур будзе спрыяць супрацоўніцтву, — сказаў Рыгор Шаўра, які прывёз у музейную бібліятэку сваю кніжку. Знаходзяцца ў ёй прыклады вырабаў непрафесійных народных творцаў, якія жылі ў Беларусі.

Удзельнікі семінара прапанавалі выступіць за дапамогай для Гайнаўскага музея ў міністэрствы культуры Польшчы і Беларусі і звярнуцца да іншых музеяў у Польшчы і Беларусі з прапановай супрацоўніцтва. Госці з Беларусі выявілі ахвоту сустракацца штогод, пры нагодзе арганізавання выставак. Дырэктар музея Ян Карпюк лічыць, што трэба падтрымліваць супрацоўніцтва з культурнымі асяродкамі ў Беларусі і Польшчы. Хоча ў хуткім часе завяршыць будову музея і актывізаваць выставачную і культурную дзейнасць музея.

Аляксей Мароз

„Глінянаму Вялесу" — 10 гадоў

21 снежня 2003 г. у Полацку мясцовыя літаратары і журналісты на чале з Алесем Аркушам адзначылі 10-годдзе заснавання літаратурнай прэміі Таварыства вольных літаратараў (ТВЛ) „Гліняны Вялес".

Імпрэзу вырашылі правесці як перформенс на беразе ракі Палаты ля так званага каменя ТВЛ, на якім яшчэ ўвесну была выбіта эмблема Таварыства. Удзельнікі акцыі справілі адмысловы рытуал: перадалі свае пажаданні і просьбы паганскаму богу плоднасці Вялесу праз злоўленую заранёў у Дзвіне качку, якую дэманстратыўна выпусцілі на волю. Перформенс выглядаў вельмі эфектна і меў глыбокі сімвалічны сэнс — птушка ў свабодным палёце атаясамлялася з сапраўднай вольнасцю думак у творчым самавыяўленні.

Першае ўручэнне літаратурнай прэміі ТВЛ у выглядзе статуэткі „Глінянага Вялеса" адбылося 16 снежня ў канферэнц-зале Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску. Тады яе атрымаў за зборнік паэзіі „Solus Rex" Ігар Бабкоў. Пасля „вялесаванне" было перанесена ў Полацк і праходзіла ў тамтэйшым Музеі гісторыі беларускага кнігадрукавання. Сярод лаўрэатаў прэміі былі і прызнаныя мэтры айчыннай літаратуры як Алесь Разанаў ці Уладзімір Арлоў, так і маладыя творцы як Віктар Слінко ці Альгерд Бахарэвіч. Зараз ідзе адбор наступнага кандыдата на атрыманне прэміі ТВЛ „Гліняны Вялес" за лепшую беларускую кнігу 2003 года. Але ягонае імя стане вядомае ў 2004 годзе.

Вацлаў Галімскі

Мода на „Ніву"

[1 ☞ працяг]

Раждзяства Хрыстовага і прыезду дзяцей і ўнукаў, беларусы Беласточчыны ад 1960-х гадоў у калядны перыяд чакаюць „Ніву" з яе самым справядлівым календаром, як яго назвала адна з чытачак. Ужо больш за сорак гадоў, як неад'емная частка беларускага лёсу Беласточчыны, красуецца ён прышпілены да сцяны ў самым зручным месцы нашых дамоў. Доказ папулярнасці гэтага выдання можна было паглядзець у фільмовым матэрыяле Міколы Ваўранюка ў перадачы „Самі пра сябе". Выдадзены чатырнаццацітысячным тыражом, разыходзіцца поўнасцю. Значыць, ён патрэбны людзям так, як патрэбнае беларускае слова ў інфармацыйнай прасторы. Сёння ёсць яшчэ многа тысяч беларусаў Беласточчыны, якім чытанне кірылічнага шрыфту не з'яўляецца праблемай. Праблема сядзіць у нас саміх — ці мы хочам быць беларусамі. А затым падтрымоўваць сваю тоеснасць таксама і праз паўсюдную прысутнасць у жыцці нашай меншасці значна большага тыражу штотыднёвіка беларусаў у Польшчы — „Нівы". Трэба сказаць, што з'яўляемся мы народам, у якога шмат прэтэнзіі перад усім да іншых, а найменш да сябе. Вядома, шмат у чым маем рацыю, але ніхто не будзе шанаваць і лічыць партнёрам чалавека, які адракаецца свайго — часта дэманстратыўна. Ужо ў старажытнасці Платон пісаў, што веды — сіла для перамогі. „Ніва", якая выходзіць з 1956 г., была і далей з'яўляецца аграмаднай крыніцай ведаў, а таксама імпульсам нашага самаарганізавання. Зразумела, ёсць у ёй што папраўляць і змяняць. Не без віны і сама рэдакцыя. Пра многае важнае не пісалася, але гэта можна разам з чытачамі выпраўляць. Ужо за два гады, у 2006 г., „Ніва" можа адсвяткаваць адзін з большых юбілеяў усёй беларускай прасторы — 50 гадоў друкаванага беларускага слова ў Польшчы. Слова, між іншым, дзякуючы якому ёсць нас нават афіцыйна амаль 50 тысяч. Не забывайма пра гэта. Калі парафразаваць паўтараныя ва ўсім свеце словы амерыканскага прэзідэнта, тады можна сказаць: «Не пытайся што „Ніва" зрабіла для цябе, але што ты зрабіў для „Нівы"». А зрабіць можам многа і ў самы просты спосаб. Давайце збудуем моду на „Ніву". Моду на беларускасць і яе прэстыжнасць. Колькі ж грошай выдаем штодзённа і без задумы. Колькі каштуюць штогод згаданыя прэзенты пад адны, другія, трэція святы. Адна, другая, трэцяя выпіўка. А квартальная падпіска на нашу газету каштуе толькі 26 зл., гадавая — 104 зл. Давайце будзем рабіць падпіску сваім бацькам і дзядам. Яны ўмеюць думаць. Штотыдзень „Ніва" ў іх хаце — гэта радасць ад сустрэчы з родным. Падпісацца для сябе, або зрабіць такі падарунак сваім дзецям, сябрам, знаёмым. Ведаем, якое зараз матэрыяльнае становішча. Многія не купляюць, не падпісваюцца не толькі на „Ніву", але і іншыя газеты з-за беднасці. Але беднасць не абазначае страты беларускай годнасці. Яны таксама хочуць чытаць. Давайце дапаможам ім. Мусім дапамагчы самі для сябе. Ніхто за нас гэтага не зробіць. Мы таксама можам памацнець. І калі будзем святкаваць чарговыя Каляды ў сям'і ці ў сяброўскай кампаніі, то сама з сябе атрымаецца і размова пра нашыя, беларускія справы. Дзякуючы модзе на „Ніву".

Яўген Вапа

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гмінны цэнтр адкрыў віцэ-міністр Марэк Шчапанскі. На другім плане злева: Мікола Павільч, Ежы Паўяновіч і Кароль Тыленда

Гмінны цэнтр інфармацыі ў Нараўцы

На адкрыццё Гміннага цэнтра інфармацыі ў Нараўцы 16 снежня 2003 года прыбылі намеснік міністра гаспадаркі, працы і сацыяльнай палітыкі Марэк Шчапанскі, намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч і намеснік маршалка ваяводства Караль Тыленда.

Войт Нараўчанскай гміны Мікола Павільч паінфармаваў, што ў асноўным сродкі на адкрыццё цэнтра інфармацыі (40 тысяч злотых) атрымалі з Міністэрства гаспадаркі, працы і сацыяльнай палітыкі ў рамках праграмы прафесійнага актывізавання выпускнікоў „Першая праца". За гэтыя грошы купілі 5 камп'ютэраў, факс, друкарку, сканер і ксеракс. Памяшканне падрыхтавалі ў Гмінным асяродку культуры і да працы ў цэнтры прызначылі 6 асоб, з ліку якіх частка праходзіць стажыроўку. Прадбачваецца, што цэнтр будзе адкрыты кожнага дня па 14 гадзін.

— Гмінны цэнтр інфармацыі будзе вялікім акном у свет. Шанц развіцця гміны бачым у турызме, а цэнтр дапаможа інфармаваць пра нашыя турыстычныя прапановы. Будзем таксама дапамагаць гаспадарам здабыць інфармацыі пра непасрэдныя даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі, — заявіў войт Мікола Павільч.

Віцэ-міністр Марэк Шчэпанскі сказаў, што цэнтр дапаможа хадайнічаць аб сродкі на развіццё гміны і перасцерагаў работнікаў, каб шукаючы інфармацыю навучыліся адкідаць усялякае інтэрнэтнае смецце. Паводле віцэ-маршалка Кароля Тыленды, цэнтр дапаможа прыцягнуць вонкавы капітал для рэалізацыі турыстычных і гандлёвых інвестыцый.

— Мы будзем інфармаваць аб рынку працы ў нашай гміне, павеце, ваяводстве, краіне і за мяжой. Будзем памагаць выпускнікам нашай гімназіі шукаць сярэднія школы і пасля інфармаваць пра спецыяльнасці на вышэйшых установах. Прадпрымальнікам будзем памагаць шукаць партнёраў. Турысты будуць маглі даведацца пра культурныя і турыстычныя мерапрыемствы ў нас і пра цікавыя месцы ў Белавежскай пушчы, — сказала кіраўнік цэнтра Кацярына Бяляўская.

Аляксей Мароз

Зразумець непрацаздольных

У Бельску-Падляшскім ужо ад адзінаццаці гадоў дынамічна развіваецца Згуртаванне непрацаздольных асоб „Szansa", няўрадавая арганізацыя, якая працуе ў карысць шырокай інтэграцыі ўсяго грамадства. Актыўнасць „Шанса" скіравана на ломку ўсіх перашкод і стэрэатыпаў, якія з'яўляюцца вынікам нашага няведання пра непрацаздольных.

У ліку дасягненняў „Шанса" маем курсы, лагеры, аздараўляльныя туры, спартыўныя і забаўляльныя мерапрыемствы, мастацкія, адпачынковыя і культурныя пачыны, якіх агульнай мэтай з'яўляецца медыцынскае, прафесійнае і грамадскае аздараўленне. Усе гэтыя мерапрыемствы з'яўляюцца вынікам сумленнай працы ўправы арганізацыі і яе паспяховага супрацоўніцтва з мясцовым самакіраваннем, аддзелам Дзяржаўнага фонду рэабілітацыі непрацаздольнах асоб у Беластоку, спонсарамі...

2003 год быў аб'яўлены Еўрасаюзным годам непрацаздольных людзей і на гэты конт у Бельску адбылося шмат мерапрыемстваў. У пачатку верасня згуртаванне прыступіла да выканання трохмесячнай праграмы пад лозунгам „Непрацаздольныя — такія іншыя ці такія самыя". Праграма была накіравана школьнікам Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў.

Як падкрэсліла Барбара Асташэўская, валанцёрка згуртавання „Шанс", пуцяводнай ідэяй праграмы меў быць штуршок у напрамку сапраўднага зацікаўлення моладзі клопатамі непрацаздольных асоб, ломка псіхалагічных бар'ераў і адмоўных стэрэатыпаў, якія ў сучаснасці — у час сусветнай глабалізацыі, палётаў на Марс і камп'ютэрызацыі жыцця — не павінны мець месца, адно трэба зразумець і адобрыць непрацаздольнага суседа.

Міхал Мінцэвіч

Асцярожна з крытыкай!

У час лістападаўскай сесіі Падляшскага сейміка дайшло да прэцэдэнту. Быў адкліканы віцэ-старшыня прэзідыума, адзіны засядаючы ў ім прадстаўнік апазіцыі — Славамір Згжыва (клуб Грамадзянскай платформы — Права і справядлівасць — PO PiS).

Адбылося ўсё гэта пасля павальнай крытыкі папярэдняй правай ваяводскай управы, якую ачольваў якраз Згжыва. Пад заявай падпісалася ўся цяперашняя ўправа з маршалкам Янушам Кшыжэўскім, старшынёй сейміка Збігневам Кшывіцкім і некалькімі раднымі з кіруючых ваяводствам клубаў (СЛД — ПСЛ — Падляшская народная ініцыятыва — былая Самаабарона). Неафіцыйна даведаліся мы, што персанальна з ініцыятывай адклікання выступіў Збігнеў Кшывіцкі, званы некаторымі ваяводскімі чыноўнікамі МУ галоўным ваяводскім кадравікам гэтага склікання. У абгрунтаванні заявы напісана было м.інш.: „Крэдыт даверу, якім яго адорылі, быў сістэматычна нішчаны адораным. Праяўлялася гэта ў публічных выказваннях, якія беспадстаўна ганьбавалі працу ўправы і сейміка". Далей сцвярджалася, што „не былі яны апраўданыя, а прытым стваралі некарысны вобраз ваяводскага самаўрада". Прытым было дададзена: „Управа са свайго боку шматразова стрымлівала выказванні сваіх крытычных ацэнак, якія датычылі працы папярэдняй кадэнцыі". Падпісанты заўважылі таксама, што быццам бы „некарысныя для вобразу ўправы і сейміка выказванні" мелі служыць выбарчай кампаніі адкліканага; Славамір Згжыва хадайнічаў за сенатарскі мандат ад Грамадзянскай платформы ў дапаўняльных выбарах.

Яшчэ да галасавання, засядаючы ў час сесіі не за прэзідыумным сталом, а ў зале абрад, з трыбуны Славамір Згжыва падзякаваў за супрацоўніцтва:

— Нельга гаварыць аб крэдыце даверу, якім мела адорыць мяне кіруючая каліцыя, бо такіх размоў і пагадненняў не было. Іначай было б гэта ў пэўным сэнсе карупцыйным, звязаным з магчымасцю свабоднага выказвання мною думак. Я стараўся, каб мая крытыка прымалася пад увагу. Час ад часу я хваліў управу.

У абароне Згжывы, а хутчэй крытычна ў адносінах да падпісантаў, выказваліся прадстаўнікі PO PiS. Лідэр гэтага клуба Кшыштаф Путра грымеў:

— Панесла ўяўленне пішучых гэту заяву! Абгрунтаванне ўзятае родам з ПНР, а, дакладна, з пяцідзесятых! Сеймік — не ваш прыватны фальварак. Сеймік — супольнае дабро. Палітычная культура патрабуе, каб апазіцыя мела прадстаўніка ў сваім заканадаўчым органе. Вырашылі аб гэтым выбары. Прабуеце зачыняць вусны, каму ўдасца.

Іншы з радных PO PiS Цэзары Цеслюкоўскі крычаў:

— Гэта вяртанне да прапаганды поспеху! Апазіцыя мае права на крытыку!

Другі апазіцыйны клуб — Ліга польскіх сем'яў (LPR) была больш памяркоўная. Яе прадстаўнікі папракнулі PO PiS, што таксама яе галасамі пасля ўстанаўлення сейміка, кандыдат Лігі не апынуўся ў прэзідыуме; не стаў адным з віцэ-старшыняў. Таму LPR устрымалася ад голасу над адкліканнем Згжывы і не выключыла, што ў час галасавання над выбарам новага старшыні, прадстаўляючага апазіцыю, запрапануе свайго кандыдата (здаецца, што гэтага ўжо не зробіць PO PiS). Аднак, прэзідыум можа застацца ў зменшаным складзе.

Віцэ-старшыня сейміка ад ПСЛ Адам Чэслаў Дабронскі пераконваў:

— Трэба дбаць аб прэстыж сейміка, аб адпаведную падборку слоў, месца, з якога яны выказваюцца, усведамляць, да каго гаворым...

І дадаў:

— Гэтае галасаванне — наш супольны пройгрыш. Мабыць, замала мы калегу Згжыву прытулялі да сэрца.

Ежы Панасюк з СЛД падкрэсліў:

— Гэтае месца ў прэзідыуме было, ёсць і будзе для апазіцыі.

На канец узяў голас, хоць раней не хацеў, маршалак Кшыжэўскі:

— Мы не пакутуем хваробай кароткай памяці. Не зачыняем вуснаў апазіцыі. Але няма ў нас згоды на распавяданне бязглуздзіцы, як гэта рабіў пан Згжыва.

Якраз з вуснаў маршалка прагучалі першыя канкрэты, на якія спасылаліся радныя кіруючай кааліцыі ў заяве. Прыгадаў ён выказванні Славаміра Згжывы аб марнатраўстве маёмасці кіруючымі і разумовым крызісе ва ўправе. Канчаткова, галасамі SLD-PSL-PIL, пры ўстрымліваючыхся галасах LPR і супраць PO PiS Славамір Згжыва быў адкліканы.

Зараз жа перад гэтым Ян Нэтэр (СЛД) ад імя рэвізійнай камісіі прадставіў ацэнку працы папярэдняй управы (заявы Найвышэйшай кантрольнай палаты) і ўзровень задоўжанасці за 2002 год, якую яна пакінула, а што скантралявала гэтая камісія. Задоўжанасць лічыцца ў дзесятках мільёнаў.

— Аж такая задоўжанасць — неабгрунтаваная, нават шпіталяў (падлягаюць яны ваяводскаму самаўраду), з якіх, як шпіталь імя Снядэцкіх, кепска кіраваліся, — ацэньваў радны Нэтэр.

У сваю чаргу кантралёры NIK адкрылі м.інш. памылкі ў састаўленні бюджэту, даныя нязгодныя з рэчаіснасцю пры акрэсліванні бюджэтных выдаткаў, шматразовае парушэнне закону аб публічных заказах, непарадак у працаўнічых актах, неаплачванне ЗУСаўскіх узносаў, а толькі перасыланне дэкларацый.

— Гэта праява крайняй негаспадарлівасці. Даўгі падмяталіся пад дыван! — згодна ацанілі сёння кіруючыя ваяводствам.

Яшчэ раней прайшла, галасамі большасці, заява аб прызнанні маршалку спецыяльнага дадатку (у прынцыпе, аб яго ўтрыманні, паколькі папярэдні маршалак таксама яго атрымліваў) у першую чаргу на прамоцыю ваяводства ў краіне і ў свеце ды здабыванне еўрапейскіх сродкаў. Згодна з адпаведным законам, мог ён сягаць ад 20% да 40% заработнай платы. Галасамі большасці назначана маршалку максімальная стаўка — блізка 2 тыс. 700 злотых. Тым самым Януш Кшыжэўскі зарабляе больш за 10 тыс. зл. Не перашкодзілі ў назначэнні дадатку нават крытычныя галасы, ацэньваючыя працу маршалка, для прыкладу, Альжбеты Каўфман-Сушко (PO PiS). Папракнула яна, што маршалак ад года, значыць, ад пачатку паўнамоцтваў, зацята знішчае ўсё, што служыць грамадскай палітыцы. Януш Кшыжэўскі абураўся:

— Вы, пані, свеціце крывадушнасцю. Проста — ілжэце!

У час інтэрпеляцый і пытанняў, вядомы, так сказаць, з супярэчлівых выказванняў наконт нацыянальных меншасцей, радны ад LPR Зэнан Дзедзіц заклікаў да спольшчвання назваў на ўказальніках на шляху Беласток — Каўнас літоўскіх мясцовасцей на Літве.

— Гэта чужыя назвы на тэрыторыі Польшчы, — абураўся радны ад Лігі польскіх сем'яў.

Ягонае абурэнне не знайшло, аднак, водгуку з боку апошніх самаўрадаўцаў.

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Стары драўляны дом па вуліцы 3 Мая

Захаваць старую архітэктуру

На XII сесіі Рады горада Гайнаўка, якая адбылася ў першай палове снежня 2003 года, сакратар Таварыства аховы краявідаў Анджэй Корбель прапанаваў захаваць старыя дамы ў Гайнаўцы ў якасці атракцыёна для турыстаў. Прадставіў ён фатаграфіі старых будынкаў па вуліцы Касідлаў і вялікага старога дома па вуліцы 3 Мая — сведкаў мінулага Гайнаўкі. Будынкам характэрны аздобы, якія не сустракаюцца ў іншых рэгіёнах Польшчы. Госць Рады прадставіў фатаграфіі былой гарадской лазні і адміністрацыйных будынкаў прадпрыемства „Фурнель" — прыкладаў сацрэалістычнай архітэктуры. Нэля Шчука з Таварыства аховы краявідаў параўнала на падставе фатаграфій выгляд даваеннай Гайнаўкі з сённяшняй архітэктурай. Аказалася, што прыгожыя драўляныя адна- і двухпавярховыя дамы замянілі буйнапанельныя блокі. Па вуліцы 11 Лістапада знаходзіцца жылы дом, які быў перабудаваны з выкарыстаннем новых тэхналогіяў, але захаваў арыгінальны архітэктурны выгляд. Госці сесіі прапанавалі, каб у гэтым напрамку ішла мадэрнізацыя старога будаўніцтва.

Намеснік старшыні Рады Мікола Галёнка прадставіў прапановы па развіцці турызму ў Гайнаўцы. Неабходна лепш азначыць турыстычныя месцы ў горадзе і выдзеліць месцы пад аўтастаянкі, збудаваць веласіпедныя і пешаходныя сцежкі, дакончыць будову турыстычнай чыгункі.

Радная Ядвіга Рудзінская-Патэюк прапанавала задумацца, ці варта выручаць вышэйшую ўстанову і выдаткоўваць грошы на ўтрыманне Гайнаўскага аддзялення Беластоцкага політэхнічнага інстытута. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк патлумачыў, што ў Гайнаўскім аддзяленні няма яшчэ поўнага пяцігадовага набору і таму трэба фінансава ўспамагаць з гарадскіх сродкаў развіццё вышэйшай установы. Пасля павінна яна зарабляць на сябе. Бурмістр паінфармаваў аб праекце дамовы паміж горадам і павятовым старостам — інвестарамі будовы крытага басейна побач Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Плануецца, што інвестары са структурных фондаў Еўрасаюза і „Таталізатара" атрымаюць сродкі на 75% коштаў будовы.

Аляксей Мароз

Афрыканскі капіталізм

Мае знаёмыя, якія пры канцы васьмідзесятых гадоў пачыналі будаваць беластоцкі капіталізм на базары па вуліцы Бэма, а пасля сталі ўласнікамі будаўнічай фірмы, даўно пакінулі прыватны бізнес. У 1994 годзе давалі яны працу для 38 чалавек, сумленна плацілі падаткі і ўсе астатнія належнасці, якія фармальна падаткамі не называюцца. Пры канцы дзевяностых гадоў, — пераконвалі мяне, — ніхто, хто не меў за сабой падтрымкі з боку крымінальнай ці палітычнай мафіі і сумленна разлічваўся з казной, не мог праіснаваць на рынку. Хабары, якіх дамагаліся чыноўнікі ці народныя дэпутаты значна перавышалі прыбытак ад гаспадарчай дзейнасці. Ператрывалі толькі тыя фірмы, якія, напрыклад, давалі працу для 38 чалавек, але плацілі падаткі ад васьмі работнікаў. Прадпрымальнікі бралі на працу людзей без вопыту і адпаведнай падрыхтоўкі, плацілі ім паводле правілаў эканомікі XVIII стагоддзя.

На рынку праіснавалі толькі такія прадпрымальнікі, якія адкінулі ўсе прынцыпы сучаснага капіталізму. Прапаў бы, напрыклад, кожны, хто захацеў бы прадукаваць каўбасу з мяса ці масла са смятаны. Купляем усё, што толькі падобнае на малако, хлеб, сыр ці вэнджаны кумпяк, але плацім як за сапраўдныя прадукты. Канкурэнцыя паміж вытворцамі харчовых прадуктаў абмяжоўваецца да таго, хто паставіць на рынак таннейшы тавар з падобнай назвай. Усё астатняе — малаважнае. Часам вырашальную ролю адыгрывае ўпакоўка. Напрыклад, звычайная сечка з травы бліжэй неакрэсленага паходжання выступае пад назвай кітайскай ці індыйскай гарбаты. На каробцы пішуць пра гэта нават пазалочанымі літарамі. Смакам сучасны „юнан" ці „мадрас" часта напамінае „папулярную", якую прадавалі па талонах падчас ваеннага становішча.

Найбольш прыбытковы бізнес для ўсялякага роду жулікаў дае сёння гандаль электроннымі прадуктамі. Беластоцкая фірма „Цыбэрнэт", якая займаецца продажам паслуг па інтэрнэтавай сувязі, дае гарантыю на кругласутачнае карыстанне гэтым самым навейшым сродкам інфармацыі. Трэба толькі на пачатак заплаціць 400 злотых, а пасля рабіць штомесячныя ўзносы па 50 злотых на рахунак фірмы. У мяне дома інтэрнэт, згодна з параметрамі акрэсленымі ў дамове, дзейнічаў толькі два месяцы. Пасля пачалі выступаць перапынкі — ад 2 да 5 дзён. Уласнікі фірмы тлумачылі, што дзесь там далёка ад іх здарылася аварыя. У апошні час перапынкі трываюць часам па два тыдні. Калі пазваню і паінфармую, што няма сувязі, адказваюць: „Гэта немагчыма, зараз прыедзем і праверым". Сапраўды прыязджаюць і ўсё становіцца на свае месцы. Дзве гадзіны пасля ад'езду спецыялістаў усё вяртаецца да афрыканскай нормы.

Сусед некалькі месяцаў таму купіў новы камп'ютэр у фірме, якая спецыялізуецца ў продажы электроннай тэхнікі. Заплаціў 3,5 тысячы злотых. Прадукт апячатаны, з гадавой гарантыяй безаварыйнай працы. На рахунку пералічаны цэны ўсіх дэталяў, з якіх складаецца камп'ютэр. Падчас эксплуатацыі аказалася, што не вытрымлівае ён ніякіх нормаў. Інфарматык, які праверыў новую цацку, аж за галаву схапіўся. Прадукт у цэласці варты быў толькі 2,5 тысячы. Жулікі прынялі рэкламацыю, але наўпіхалі частак з яшчэ горшымі параметрамі. Сусед не ведае, што рабіць — ісці на паліцыю, ці яшчэ раз прасіць „бізнесменаў", каб аддалі яму тавар, за які заплаціў.

У краінах традыцыйнага капіталізму найважнейшы ёсць давер да асобы і фірмы, якую яна прадстаўляе. Гэта гарантыя ўсялякай паспяховасці на рынку. У нас самае важнае ў дзейнасці прадпрымальніка — як абдурыць партнёраў. Сумленна, вядома, ніхто ніякага бізнесу весці не зможа, таму што не дазволіць на гэта хмара чыноўнікаў і кантралёраў. Праіснаваць можна толькі чыімсьці коштам, найчасцей пакупніка тавараў і паслуг. Толькі адзін на тысячу ашуканых мае ахвоту шукаць справядлівасці ў дэмаралізаваных супрацоўнікаў пракуратуры ці судовых органаў. Пра гэта добра ведаюць г.зв. прадпрымальнікі і ўспрымаюць такі стан як самы вялікі капітал. Дакладна так як у большасці краін над ракой Конга.

Яўген Міранові́ч

Вачыма паляка

Заляцанкі раднага Путры

У час апошняй сесіі Падляшскага сейміка дайшло да вельмі цікавага абмену думкамі паміж раднымі ад апазіцыі. Вядомы з кантраверсійных, зачапляючых за нацыяналізм выказванняў Зэнан Дзедзіц з Лігі польскіх сем'яў (LPR) папракаў вядомага палітычнага дзеяча Права і справядлівасці (PiS) Кшыштафа Путру (калісьці Паразуменне Цэнтр — PC) у... масонскім ухіле. Дыялог адбыўся больш-менш такі — Кшыштаф Путра: *Падляшскае ваяводства — асаблівае: шматкультурнае і шматканфесійнае...* Зэнан Дзедзіц: *Няма такога паняцця — шматкультурнасць, а маем шмат культур. Шматкультурнасць — гэта з масонскай мовы!* Кшыштаф Путра: *Калі я кажу шматкультурнасць, дык разумею гэта так, што няма аднае культуры, а ёсць іх шмат. На Падляшшы маем шмат культур і народаў. Гэта грамадзяне-палякі, гэта наша вялікае багацце і мы павінны гэтым карыстацца.*

Здзівіла мяне ў гэтым кароткім дыялогу не становішча раднага Дзедзіца, бо з яго боку нішто ўжо не можа здзіўляць, але гучнае выказванне такой думкі Кшыштафам Путрам. Вось лідэр рэгіянальнага PiS стае ў абарону меншасцей, прычым, здавалася б, падвяргаючыся крытыцы хоць бы ў частцы ідэалагічна блізкай фармацыі, якую прадстаўляе радны Дзедзіц. У чым справа? — пачаў я сам у сябе пытацца ў час тае сесіі. Прыглядаюся дзеянням Кшыштафа Путры і ягоных калег ад шмат гадоў, сярод іх — найбліжэйшаму яму, былому прэзідэнту Беластока, былому дэпутату, а цяпер сенатару Кшыштафу Юргелю. Ніяк не магу прыпомніць сабе, каб калі-небудзь з нейкім сантыментам адносіліся яны да меншасцей пражываючых у Беластоку і на Падляшшы. У час прэзідэнтуры сенатара Юргеля і ўлады PC даходзіла нават да, так сказаць, скрогатаў. Цяпер, калі гляджу на тое, што дзеецца ў беластоцкай Гарадской радзе, дзе на заяву партыйных калег Кшыштафа Путры адклікаюць з пасады праваслаўнага віцэ-старшыню Рады Марка Масальскага, і то па прычыне няясных закідаў, здзіўляюся яшчэ больш.

У кулуарнай размове з радным Путрам крыху мяне прасвятліла. Сказаў мне ён, што на шматкультурнасць могуць пайсці вялікія сродкі з Еўрасаюза, якія будуць служыць развою ўсяго рэгіёна. Ну і стала ясна: на гарбе меншасцей можна нагрэбці грошай. Здаецца мне, што ўсё гэта досыць цынічнае, асабліва ў вуснах Кшыштафа Путры. Не буду здзіўляцца, калі ў найбліжэйшых парламенцкіх выбарах PiS будзе какетнічаць да меншасцей, асабліва да беларускай і запрапануе ёй месца на сваім спіску. Меншасці, аднак, прачуленыя, і памяць у іх некароткая, дык могуць меркаваць, што ўхажора трэба пачаставаць чорнай поліўкай.

Вернемся да раднага Дзедзіца. У час апошняй сесіі здалося мне, што ўдалося мне зведаць яго больш дакладна. Гэта дзякуючы кніжачцы ягонага аўтарства, якую раздаваў. Прысвечана яна Каталіцкаму таварыству службы дзецям, якое Дзедзіц заснаваў. Займаецца яно сацыяльнай паталогіяй сярод малалетак. Не даведаўся я з яе, праўда, ці шматкультурнасць гэта таксама паталогія, тым не менш прачытаў я аб педагогіцы пазітыўных узораў, прапаведваных радным, а якія маюць за мэту *prostowanie młodych ludzi* з паталагічных сем'яў, закранутых алкагалізмам, наркаманіяй і г.д. У пэўны момант пацешыў мяне фрагмент аднаго з прыкладных лістоў, падпісаных аўтарам кнігі... братам Зэнанам. *Dawno temu, gdy jeszcze nie było samochodów, a ludzie pokonywali odległości pieszo, nieliczni zaś jeździli konno, pewien bardzo bogaty chłop miał dwie córki...* Праўда ці не — логіка таго абзаца найменш што здзіўляе, бо *cóż ma piernik do wiatraka*? Дарэчы, так як і шмат што з выказванняў пана раднага, значыць, брата Зэнана.

Мацей Халадоўскі

Пленум ГП БГКТ

Пленарнае пасяджэнне Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства адбылося 21 снежня 2003 г. з удзелам кіраўнікоў устаноў культуры, настаўнікаў, прадстаўнікоў самаўпраўленняў і консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандра Харытонава. Распачалося яно ад паведамлення, што Тамара Русачык, член Прэзідыума ГП і адначасова метадыст па беларускім школьніцтве на Беласточчыне з нагоды 50-ай гадавіны з дня нараджэння ўзнагароджана віншавальна-падзячным лістом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Затым хвілінай цішыні ўшанавана была памяць нядаўна памерлай Ірэны Тшэцяк — удзельніцы харавога калектыву ў Агароднічках.

Пленум прысвечаны быў абмеркаванню дзейнасці БГКТ у летнім сезоне 2003 года, планаў і перспектываў дзейнасці БГКТ на 2004 год, спраў беларускай асветы і школьніцтва ды сітуацыі з Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Абшырную справаздачу аб дзейнасці БГКТ у летнім сезоне 2003 года зрабіла сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч. Пры дапамозе мясцовых улад, самаўпраўленняў і ўстаноў на працягу мінулага лета арганізаваны быў 21 народны беларускі фэст у Дуброве-Беластоцкай, Саколцы, Крыначцы, Гайнаўцы, Курашаве, Міхалове, Галадах, Залуках, Хітрай, Бандарах, Тафілаўцах, Сямятычах, Кляшчэлях, Семяноўцы, Чаромсе, Чыжах, Бельску-Падляшскім, Залуках, Новай Волі і Гарадку над залівам. Формы фэстаў былі разнастайныя, часта спалучаныя са спартыўнымі гульнямі, спаборніцтвамі пажарных каманд, з конкурсамі і забавамі, традыцыйнымі дажынкамі, з лакальнымі святкаваннямі, важнымі для данага асяроддзя гадавінамі. Усе яны былі багатымі па сваёй праграме. Выступала на іх заўсёды 5-7 мастацкіх самадзейных калектываў, у тым прынамсі адзін калектыў з Рэспублікі Беларусь. У 2003 годзе па запрашэнні ГП БГКТ і пры дапамозе Генеральнага консульства на нашых сцэнах выступіў 21 калектыў з Беларусі ў 52 мясцовасцях.

Нашыя калектывы прадстаўлялі беларускую меншасць на вялікіх міжнацыянальных мерапрыемствах. І так гурт „Лідэр" удзельнічаў у „Надбужанскіх спатканнях артыстычных" у Грубяшове і ў „Сустрэчах культуры нацыянальных меншасцей" у Пуньску. „Расспяваны Гарадок" прадстаўляў нашу беларускасць на Міжнародным фестывалі „Еўропа без граніц" на Гары Святой Анны. Калектыў „Крыніца" выступаў на „Сустрэчах культур" у Пуньску, „Васілёчкі" ўдзельнічалі ў канцэрце „Супольнасць у культуры" ў Варшаве, „Прымакі" выязджалі з канцэртамі на Беларусь, у гэтым ліку ўдзельнічалі ў міжнародным фэсце „Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах, а наш наймаладзейшы калектыў „Лучына" выступаў на „Фолькавых спатканнях" у Любліне.

Вялікім і мнагалюдным мерапрыемствам было „Свята беларускай культуры", якое адбываецца заўсёды ў гарадскім амфітэатры ў Беластоку. Выступілі на ім 33 калектывы з Беласточчыны, хор „Акварэлі" і духавы аркестр з Гродна. Усіх разам самадзейных артыстаў налічвалася 450 асоб. На гэты канцэрт прыйшло больш за пяць тысяч чалавек.

Самым мнагалюдным мерапрыемствам БГКТ з'яўляецца „Купалле" ў Белавежы. Паводле ацэнкі знаўцаў прыбыло на „Купалле" ў 2003 годзе каля 15 тысяч чалавек. Выступіла 16 калектываў з Беласточчыны і гурты „Церніца" з Мінска і „Шкляры" з Бярозаўкі. Усіх разам было 350 самадзейнікаў.

Беларускае таварыства заўсёды многа ўвагі адводзіць міжнароднай навуковай канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці". На дзевятую па ліку канферэнцыю паступіла 136 заявак ад навукоўцаў. Прынятых было на гэты форум 100 дакладаў. Канферэнцыя адбывалася 18-20 ліпеня ў гасцініцы „Тры сасны" ў Клеасіне. Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны ў асобнай кніжцы.

У мінулым годзе XI Міжнародны фестываль польскай і беларускай песні „Гродна-Беласток" адбыўся ў Беластоку. З Гродзеншчыны выступіла 12 польскіх, а з Беласточчыны — 11 беларускіх калектываў. Усе выступленні добра ўспрымаліся 5-тысячнай беластоцкай публікай.

З кожным годам павялічваецца ранг і папулярнасць велізарнага, канцэртнага мерапрыемства ў Гарадку „Сяброўская бяседа". У 2003 годзе ўдзельнічала ў ёй 35 беларускіх калектываў з Беласточчыны, гурт „Клекацякі" з Боцькаў і 3 калектывы з Рэспублікі Беларусь — „Стрэчанне" з Мазыра, „Шкляры" з Бярозаўкі і танцавальная група Вучылішча мастацтва з Гродна. Удастоілі яе прадстаўнікі ўлад Польшчы і Беларусі, у гэтым ліку і намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Дражын.

І яшчэ адна вялікая, двухдзённая імпрэза, якой таксама суарганізатарам было ГП БГКТ — агульнапольская прэзентацыя культуры нацыянальных меншасцей „XIII Музычныя дыялогі над Бугам". Выступалі на ёй мастацкія калектывы шматлікіх нацыянальных меншасцей пражываючых у Польшчы — немцы, лэмкі, грэкі, ромы, славакі, яўрэі, украінцы.

На многіх мерапрыемствах літаратары падпісвалі свае кніжкі, а дырэктар Цэнтра прэсы і кніжкі славянскіх народаў Янка Заброцкі з Варшавы на сваіх прылаўках прапанаваў багаты выбар кніжак. Прэзентаваўся таксама кірмаш мастацкіх вырабаў з удзелам народных майстроў.

Сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч прадставіла членам пленума галоўныя напрамкі дзеяння і планы працы БГКТ у 2004 годзе. Яны падобныя да папярэдніх гадоў, таму што яны ўжо праверанымі і менавіта такія патрэбныя ў нашым беларускім асяроддзі. Да іх дададзены толькі святкаванні юбілеяў нашых калектываў, а менавіта: у канцы красавіка 50-годдзе дзейнасці адзначыць „Расспяваны Гарадок". У канцы ліпеня — 10-я гадавіна дзейнасці „Рэчанькі" з Козлікаў. На пачатку лістапада — 20-годдзе хору „Крыніца" з Беластока, а ў яго канцы — 40-я гадавіна „Васілёчкаў" з Бельска-Падляшскага.

Праблему беларускай асветы і школьніцтва рэферыравала Тамара Русачык — метадыст беларускага школьніцтва. Паведаміла яна, што беларускай мове навучаецца цяпер 3 632 школьнікі. У 25 пачатковых школах роднай мове вучыцца 1 793 вучні, у 15 гімназіях — 1 009, і ў двух ліцэях — 830 навучэнцаў. Тамара Русачык і некаторыя члены пленума выказалі занепакаенне націскам украінскіх дзеячаў, якія рознымі спосабамі намагаюцца, каб у беларускія школы „ўціснуць" украінскую мову.

Апошні пункт парадку пленума прысвечаны быў справам Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Існуючыя праблемы гэтай установы прадставіў старшыня ГП Ян Сычэўскі. Найважнейшай справай цяпер з'яўляецца здача будаўнікамі ў карыстанне музейнага будынка і ўрэгуляванне ўласнасці БГКТ.

Пленум, па прапанове Алы Каменскай, закончыўся спяваннем папулярных калядных песень.

Міхась Хмялеўскі

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Куцця ў школе ў Новай Волі

18 снежня настаўнікі і вучні Пачатковай школы ў Новай Волі (Беластоцкі павет) запрасілі „Ніву" на Куццю. Яе тут арганізоўваюць шмат гадоў. Ва ўрачыстасці ўдзельнічаюць бацькі вучняў. Яны дапамагаюць падрыхтаваць стравы.

Урокаў у школе ў той дзень не было. Прыйшлі бацькі са сваімі дзецьмі-вучнямі, прыехалі запрошаныя госці, між іншым, старшыня Гміннай рады ў Міхалове Тадэвуш Бобель і інспектар гміннай асветы — Аляксандр Апяцёнак. У школе панаваў прыўзняты настрой.

Найперш школьнікі выступілі з абрадавым спектаклем са спяваннем каляд, які падрыхтавалі пад кіраўніцтвам настаяцеля мясцовай парафіі айца Яраслава Шчэрбача. Са святам Каляд і Новым годам віншавалі прысутных прадстаўнікі міхалоўскіх гмінных улад і святар Я. Шчэрбач.

За сталы з рытуальнай ядой запрасіў святар і дырэктарка ПШ у Новай Волі Вольга Стоцкая. Было больш за 12 страў, у тым ліку традыцыйныя, як куцця з макам, боршч з грыбамі, рыба і селядцы. Кожная страва мела сваё сімвалічнае значэнне. Мак мае прынесці дастатак і багацце, а куцця — вечнае жыццё. Боршч з грыбамі — каб разам са стравай спалучыцца з сілай і смакам зямлі. Такім чынам Куцця выглядае як магічнае, паэтычнае і поўнае добрых спадзяванняў свята.

Калі ўдзельнікі ўрачыстай вячэры крыху падсілкаваліся, пачалі ўсе разам спяваць калядкі.

Янка Целушэцкі

Аўтарскія сустрэчы „белавежцаў"

Студэнты беларусістыкі Беластоцкага універсітэта пад канец мінулага года сустрэліся з беларускімі паэтамі Юркам Баенам і Янам Чыквіным. Спатканні арганізавалі выкладчыцы беларускай літаратуры Галіна Твараповіч і Анна Саковіч. Мерапрыемствы адразу знайшлі шырокае кола прыхільнікаў.

Першае спатканне, якога госцем быў Юрка Баена, паказала якім зацікаўленнем карыстаецца паэзія „белавежцаў". Моладзь (больш пяцідзесяці асоб) аказалася падрыхтаванай: ведала раней выдадзеныя аўтарам зборнікі і змешчаныя ў іх вершы.

Юрка Баена дэбютаваў на старонках „Нівы" ў 1973 годзе, маючы шаснаццаць гадоў, закончыў геаграфію ў Люблінскім універсітэце і з верасня 1980 года працуе настаўнікам геаграфіі ў бельскай „тройцы". Большасць прысутных на сустрэчы студэнтаў былі яго вучнямі ў пачатковай школе, і хаця мінула столькі гадоў, настаўнік-паэт добра памятаў імёны сваіх вучняў, што ўвяло адразу сяброўскую атмасферу.

Захопленыя паэзіяй студэнты не баяліся ставіць пытанні, стараючыся пры гэтым лепш зразумець інтэнцыі паэта. На пытанне чаму займаецца геаграфіяй паэт адказаў, што геаграфія з'яўляецца навукай, якая ніколі не хлусіць, бо ўсё ў ёй лагічнае, канкрэтнае, матэматычна растлумачанае, не так як у гісторыі.

8 снежня адбылася другая сустрэча, гэтым разам са старшынёю Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" Янам Чыквіным. Паэт — прадстаўнік актыўнага пакалення беларусаў Беласточчыны, аўтахтонаў, якія не маглі не стварыць свае арганізацыі. Гаворачы аб творчасці, Ян Чыквін сцвердзіў, што „нягледзячы на цяжкасці, найгоршае — гэта асіміляцыя, бо ўсё перабягае цераз польскі фільтр. Паэт ніколі не можа забыць аб сваіх каранях", якія даюць найлепшыя падваліны для стварэння ўласнай індывідуальнасці, стылю.

Паэт прачытаў свае вершы і сцвердзіў, што цяпер знаходзіцца ў творчым пасіве. Студэнты з недаверам паставіліся да гэтай заявы. Не памаглі нават тлумачэнні паэта, што творчая вена прыходзіць неспадзявана, што не можа пісаць ён пад заказ, сеўшы „так сабе" за пісьмовы стол з пастанаўленнем напісаць шэсць-сем вершаў. Сабраныя хацелі паслухаць намнога больш вершаў паэта, на што не дазволіла абмежаванае часам спатканне, якое закончылася гарачымі апладысментамі.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

IV „ц" клас з выхавацелькай Валянцінай Бабулевіч

Калі за партай дзяўчына і хлопец...

Дзеці з IV „ц" класа ў бельскай „тройцы" прагнулі прачытаць пра сябе ў „Зорцы". Вось, дарагія сябры — хай гэты артыкул будзе вам пад ёлку!

Нашы сябры заслужылі на падарунак. Дванаццаць асоб ходзіць на заняткі тэатральнага гуртка ў Бельскім доме культуры, якім апякуецца Альжбета Фіёнік.

— Цяпер мы працуем над пастаноўкай „Як калісь калядавалі", — кажа Куба Філіпюк.

— Проша пані, — крычаць дзеці, — а Куба ўжо ёсць у „Зорцы".

Сапраўды, у дзень, калі мы сустрэліся, выйшла новая „Ніва", а ўсярэдзіне — хто? Наш Куба — дэкламатар-лаўрэат „Роднага слова".

— І я быў у Нараўцы, — дадае аднакласнік Матэвуш Магрук. Матэвуш таксама дэкламатар-лаўрэат.

У IV „ц" класе 25 вучняў — 13 хлопцаў і 12 дзяўчынак. Клас лічаць у школе не надта „гжэчным". Дзеці ведаюць пра гэта ды абяцалі паправіцца.

— Замнога праседжваем перад тэлевізарам, — прызнаецца Адам Ткачук, — ідзем позна спаць, а раніцай баліць галава.

— Нашы хлопцы бітлівыя, — скардзяцца дзяўчынкі.

Таму калі за партай сядзяць дзяўчына і хлопец, значыць — хлопец бітлівы або спісвае, або ўсё нешта хоча пазычаць.

Палова вучняў заявіла, што іхнім любімым прадметам фізкультура.

— У нас найбольшая гімнастычная зала, — кажа з гонарам Радак Зінкевіч.

Сярод любімых прадметаў таксама беларуская мова. Навучае яе выхавацелька — Валянціна Бабулевіч.

* * *

У кароткім апытальніку нашы сябры напісалі, што іх цікавіць на ўроках беларускай мовы. Ніжэй прыводзім выбраныя думкі.

Лукаш Мартынюк: Чытаць казкі і абавязковыя чытанні (lektury).

Моніка Леанюк: Як па-беларуску завуцца лясныя і дзікія звяры.

Якуб Матэнька: Гісторыя Чарнобыльскай катастрофы.

Паўля Буйнюк: Прачытанне ўсяе „Зоркі".

Патрык Грабоўскі: Навучыцца гаварыць па-беларуску, прачытаць у „Зорцы" пра поспехі дзяцей.

Міхал Шум: Ведаць як усё завецца па-беларуску.

Радак Зінкевіч: Навучыцца цяжкіх і складаных слоў.

Рафал Гурскі: Даведацца пра мой горад.

Сільвія Верамчук: Навучыцца пісаць, чытаць, размаўляць і спяваць па-беларуску ды стаць у жыцці настаўніцай беларускай мовы.

Марцін Перавой: Навучыцца мовы маіх бабулі і дзядулі, каб размаўляць з імі па-беларуску.

Адказы Сільвіі і Марціна найбольш спадабаліся „Зорцы" і яны атрымалі ўзнагароды — касеты з беларускімі казкамі.

Апошнім, якія вельмі хацелі прачытаць ды пабачыць свой здымак на нашых старонках, таксама падарунак.

Вітайце ў „Зорцы" сябры!

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

На выстаўку бяжыць дзяўчына

— Куды спяшаешся так, Аля? —
Хлопцы дзяўчыну запыталі.
— На выстаўку бягу, як быццам,
Не выпадае мне спазніцца.

А хлопцы з кожнае нагоды
Прывыклі жартаваць заўсёды.
З яе смяюцца проста ў вочы:
— Хто ж аглядаць цябе захоча?

З кім мы мяжуем?

Летні мінуў адпачынак,
Географ на ўроку талкуе:
— Ад поўдня наша краіна
Са Славакіяй мяжуе.

Чамусьці гэтая справа
Надзвычай цікавіць Сашу:
— А з кім жа мяжуе, цікава
Да поўдня краіна наша?

Каляды

Чуеце, перамаўляюцца між сабою крупкі, перагукваюцца. Сёння, кажуць, сонца народзіцца нанава, пахінецца да лета. І Хрыстос з'явіўся свету ў гэтую ноч. Народзіны Хрыста ў народзе яшчэ называюць Калядамі. І пачнуць вялікае свята яны, крупы. Бо Вялікая Куцця сёння — першая калядная вячэра. У прыбранай хаце стаіць паблізу покуці з абразамі засланы сенам, а паверх — белым абрусам стол. Як запаліцца на небе першая зорка, і пачнецца калядная вячэра. Збяруцца, з'едуцца сямейнікі. Пойдзе кругам-карагодам гаршчок з пахкай гарачай куццёю. Трэба ўсім нагарнуць ячных зярняткаў, каб моцнымі, здаровымі, шчаслівымі былі. Бо зернечкі гэтыя чарадзейныя. Вунь і сноп на покуці ўзвышаецца — аберагае хату ад немачы і шкоды. А свечкі плачуць, трапечуцца. А сям'я ўспамінае сваіх бацькоў-дзядоў. Гэта і для іх стол раскашуе расліннай, поснай ежаю. Дванаццаць страў на тым стале. Аладкі, грыбы, кісель ягадны, рыба...

А за акном ужо калядная дружына просіцца песні спяваць, бо надыходзіць другая куцця — Шчодрая, багатая, або Шчадрэц. І як увойдуць хлопцы-дзяўчаты ў хату — дрыжыць яна ад спеваў і скокаў, аж зернечкі куцці падскокваюць. Пачынальнічак запявае, падхватнічак дапамагае, музыкі на скрыпцы, дудзе, бубне граюць, славу гаспадарам пяюць. А механоша дары збірае. Каўбасы, вяндлінка, пірагі — што толькі ні трапляе ў торбу-скарбніцу! Ды спрытнай каляднай Казе ўсё мала: брыкае, падае-памірае, просячы пачастункаў. Тут і Мядзведзь, Жораў, Калядны Дзед, Цыган з Кабылаю... Цэлую ноч гамана-весялосць не сціхае. А ўранні пабяжыць дзятва двары жытам абсыпаць — засяваць лад і шчасце. А Каляды пакоцяцца ад кута, ад покуці, ад куцці ў вясну...

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марцін Перавой і Сільвія Верамчук

Чысты ручаёк


НАТАЛЛЯ СЫЧЭЎСКАЯ, Белгімназія ў Гайнаўцы

Выплывае ручаёк з бярэзніку, уплывае ў роўны роў, што працяў лугі. Тыя лугі былі калісьці падпушчанскай балацінай, парослай багоннымі раслінамі. І роў, які выкапалі меліяруючы тарфянік, быў працягам ручайка-падрэчка, які пасля ўпадаў у Нарву. Высушылі лугі, зараслі, звалавалі, пасеялі чыстай аднароднай травой. Косяць лугі пару разоў у год, сушаць сена, але ці тая сухая трава больш смакуе жывіне, чым разнастайнае, араматнае зелле, што расло тут даўней? Цяпер нават і лотаць кінула навесну буйна заквітаць, толькі дзе-нідзе жаўцее над ручайком. Праўда, вада і ў ручайку, і ў рове досыць чыстая, і рыба таксама водзіцца, хоць ужо не той час, калі можна было пад фашынай (узмацненнем берагоў рова) кошыкам чэрпаць уюноў, а і шчупакі трапляліся — раз меншыя, раз цалкам дужманыя.

Хоць усюды расстаўлены акуратныя гмінныя сметніцы, не кожаму гаспадару хочацца везці туды гаспадарчыя нечыстоты. А здаўна вядомы „патаемны" сметнік у лясочку. Там разбітыя цагліны, анучы, дошкі, парваныя мяшкі, папера, шкло, фольгавыя торбы і торбачкі... Чаго там няма! Нават старыя тэлевізары, батарэі, жалезіва ад невядома якіх прылад, якіесьці бочачкі... Звалена тое ўсё ў ямы. Кажуць на гэтую звалку таксама „конскі могільнік". Здалёк не відаць, але ўжо чуваць.

Ручаёк быў далей крышталёва-чысты, але на яго вадзе паявіліся вясёлкавыя кольцы. І пацурчала тое брыдкае ў раўчук. Пасля — у Нарву. Не знюхаеш на лузе, чым гэта папахвае, а ў рэчцы, мабыць, тое паскудства цалкам растварылася. Не так яго і шмат яшчэ. Ды прасочваецца кропля па кроплі, дзень і ноч, ноч і дзень, і плыве далей. Выпароўвае. Але ж колькі тае прасторы над намі! Жывеш, дыхаеш. Не задумваешся ж над кожным сваім уздыхам. Усё натуральна. І над думкай кожнай. А стары сметнік — і думка-ідэй, і даслоўны, псуе добрае.

Што рабіць?

Міра Лукша

Каленямі па каштанах

ГРЫШКА ПЛЕВА, Белгімназія ў Гайнаўцы

Вучняў першых класаў мы падзялілі на дзве групы. Кожная з іх спачатку праходзіла праз „тунэль". Ён пачынаўся бакавымі ўваходамі ў залу і цягнуўся некалькі метраў. Мы збудавалі гэтую канструкцыю са школьных партаў. Паставілі іх радком і прыкрылі пледамі. Падлогу высыпалі мноствам каштаноў. „Коцікам" трэба было прайсці пад партамі, ступаючы каленямі па каштанах. На заканчэнне „тунэля" стаялі мае сябры з касметыкай. Размалёўвалі яны дзяўчатам і хлопцам губы, вочы ды шчокі. Пасля гэтых упрыгожанняў вучні выстройваліся класамі. Тады пачаліся гульні, у якіх удзельнічалі толькі некаторыя — адабраныя маімі сяброўкамі.

На пачатку з кожнага класа выбралі мы па пяць асоб. Атрымалі яны міскі з малаком — трэба было гэта выхлебтаць языком. Некалькім вучням гэта ўдалося надзвычай хутка!

Потым, іншыя ўжо вучні, „ехалі" на... начным гаршку. Адзін „коцік" сядзеў на гаршку, а тры іншыя на прычэпкі. Аб'ехалі яны залу, гудзеўшы нібы заведзеныя машыны.

Чарговая гульня рассмяшыла ўсю залу. У ёй выступіла 10 асоб. Адна асоба сядзела на крэсле, а іншая, з завязанымі вачыма, карміла яе пудынгам. У час гэтай гульні ўдзельнікі моцна запэцкаліся і смешна выглядалі. Каб даць першакласнікам трошкі перадыхнуць, адбылася лягчэйшая канкурэнцыя. Усе „каты" мяўкаюць і таму нашым першакласнікам трэба было заспяваць на кашэчай мове. Вельмі добра ў гэтым спаборніцтве паказаўся І „б" клас.

Наступная гульня выклікала вялікі смех. У міскі паклалі мы кавалачкі шакаладу і пасыпалі мукой. Нашы сябры з абпырсканымі вадою тварамі, вуснамі лавілі тыя кавалачкі з місак. Мука прыклейвалася да мокрых твараў, а белыя шакаладкі не смакавалі, але ўсе з усмешкай прайшлі праз гэтае выпрабаванне.

Дзве апошнія спробы былі ўжо для ўсіх. На пачатку правяралі мы дакладнасць першакласнікаў — яны падзеленыя на класы цэлілі каштанамі ў вёдры. У наступнай гульні „коцікі" былі павязаныя шнурочкам. Руку адной асобы звязвалі мы з нагой іншага вучня. Так злучаным вучням трэба было танцаваць пасярэдзіне залы. Танцаваць у такіх умовах вельмі цяжка, таму многія вучні выварочваліся і цягнулі за сабою сяброў. Назіраючы за гэткімі сцэнкамі немагчыма было не смяяцца!

Паўліна Ігнацюк, II „а" кл. Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

Вясёлы куточак

Ксёндз на ўроку рэлігіі:

— Што дзеецца з чалавекам, які не думае пра душу, толькі пра цела?

— Такі чалавек таўсцее, — адказвае Янка.

* * *

На ўроку геаграфіі пытаюць Янку:

— Чаму ў рэках вада?

— Каб не пыліла, калі тармозяць караблі.

* * *

— Скажы, Янка, калі пішам вялікімі літарамі?

— Вялікімі літарамі пішам тады... тады... тады, калі ў нас слабы зрок!

Андрэй Гаўрылюк

МАРТА ГУРЫН, Белгімназія ў Гайнаўцы

Польска-беларуская крыжаванка № 2

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

	Okno	▼	Paź / List	▼	Skarb	Jak	Kropka	
Księga	Klasa ▶		▼		▼	Autor ▶		▼
Książka ▶	▼					▼		
Nos ▶				Auto ▶				
		Tort ▶						
				Bank ▶				
Anioł ▶								

Адказ на крыжаванку н-р 50: Брат, шыпшына, клас, хлор, допыт. Цыкл, плод, абшар, рыс, фан, тамат.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Юстына Данельчык** і **Паўліна Мялешка** з Дубін, **Анна Зубрыцкая** і **Юстына Асіпюк** з Нарвы, **Альжбета Антанюк** з Арэшкава, **Лукаш Зіневіч** і **Ева Касацкая** з Гарадка, **Анна Баравік** з Елянкі, **Ева Казлоўская** з Бельска-Падляшскага, **Анна Раманюк** са Старога Беразова. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Эдыта

Эдытка Сухар, разам з таленавітай групай дэкламатараў, прадстаўляла школу з Орлі. Наймалодшыя, як Эдытка, падабралі жыццёвыя вершы. Вось, наша сяброўка разважала пра тое „Як дарослых зразумець".

— А ці гэта магчыма? — пытае мяне адна маленькая сяброўка.

— А як ты думаеш?

— Думаю, як мой брат. Ён кажа, што дарослыя на тое, каб расказваць нам казкі. А мы ж не малыя, каб ва ўсё верыць!

Эдытка намаўляла слухаць дзяцей, бо яны многае ведаюць. За гэта атрымала бравы.

Зорка

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Земляроб з душою мастака

Ад самых ранніх гадоў запалоніў яго багаты свет колераў. Станіслаў Паскробка думаў як затрымаць, увекавечыць той ці іншы міг казачнасці, непаўторнай прыгажосці і гарманічнасці ў прыродзе. Тое, што адыходзіць і больш ніколі не паўторыцца. І ў памяці, быццам у сне, прыходзілі да яго бачаныя пейзажы, жывыя колеры. Тады юнак быў такі шчаслівы. Значыць, такі яго прысуд лёсу.

У яго ўяўленні паяўляліся ўсялякія задумы. Захацеў усё намаляваць, каб захаваць, нічога не ўпусціць з тых бачаных вобразаў. Не заўсёды прыходзіла гэта лёгка. Прыйшла трывога, што гэта яму не пад сілу, што яно недасяжнае. А можа пакінуць гэты недарэчны намер?..

Станіслаў Паскробка, ураджэнец вёскі Рыбакі (Нарваўская гміна), хадзіў у Белавежскую пушчу, вандраваў над ракою Нарвай і захапляўся навакольным хараством. Не знаходзіў сабе супакою. Столькі хараства! Вярнуўся з прагулкі, дык за маляванне. Быў тады падуладны творчай стыхіі, запалу. Час быццам не існаваў для яго. Не было сну. Было імкненне — апантанасць намаляваць нешта сваё, душэўнае, глыбокае. Маляванне — гэта кліч душы.

Малады Станіслаў трымаў пэндзлік, абдумваў ды маляваў свой вобраз, які ўжо прасачыўся цераз яго пачуццё. Накідваў яго на палатно або паперу, песціў, дасканаліў. Не знеахвочваўся няўдачай. Астаецца заўсёды патрабавальным да сваёй карціны. Пакідаў працу над творам, калі той быў па яго асабістай ацэнцы — задавальняючы.

Станіслаў Паскробка — мастак-самавук. Ладзіць ён выставы сваіх карцін ад 1985 года. Найбольш у Беластоку. Экспанаваліся яны таксама ў Варшаве і Супраслі. У Гайнаўцы зараз яго другая самастойная персанальная выстава — у тамашнім Доме культуры. Творца дагэтуль атрымаў тры ўзнагароды і адно вылучэнне.

У Рыбаках мастак вядзе 10-гектарную сельскую гаспадарку. У яго пераплятаюцца дзве прафесіі: земляроба і мастака. Аказваецца: адна другой не замінаюць.

Янка Целушэцкі

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Іаанна Масайла

* * *

Уваходжу ў жыццё
штораз глыбей
з усё большаю няўпэўненасцю
і турботай.
Патаптаныя ідэі,
асмешаныя мары
крыжамі роспачы
значаць дарогу.
Змучаны твар
аплятае песімізм.

Кроплі надзеі
як дождж у маі
хочуць падліць дрэва аптымізму.

Адрыян Лукша

Ты

Твае вочы блакітныя як неба —
У іх безліч дабрыні.
Твае вусны салодкія, як маліны,
З іх выходзяць пяшчотныя словы.
Твае далоні кранаюць мяне.
Пахнеш веснавымі кветкамі.
Ты — кветка ружы.
Цябе нельга пакінуць і забыць.

Культурны год у Бельскай гміне

На тэрыторыі Бельскай гміны дзейнічае цяпер адзін мастацкі калектыў „Родына". У жніўні мінулага года ў вёсцы Райск адбыўся фэст, ладжаны Згуртаваннем людзей добрай волі „Рай", у якім прынялі ўдзел рэгіянальныя музычныя калектывы; фэст закончыўся танцавальнай забавай.

Найважнейшая мінулагодняя спартыўна-культурная падзея адбылася 6 ліпеня ў Галадах, дзе адзначалася 75-годдзе тамашняй пажарнай каманды. Адбыліся там спаборніцтвы пажарнікаў, а ў мастацкай частцы выступілі тры калектывы, у іх ліку і ансамбль песні і танца „Церніца" з Мінска.

Міхал Мінцэвіч

Падвойны эфект прэзентацыі

16 снежня 2003 г. у мінскай сядзібе Беларускага ПЭН-цэнтра адбылася прэзентацыя дзвюх кніжак — зборніка паэзіі Юрыя Гуменюка „Вуліца тыгровых архідэяў" і зборніка апавяданняў польскага пісьменніка-эмігранта Густава Герлінга-Грудзінскага „Наш брат — Зло" ў перакладзе Святланы Курс.

Імпрэза прайшла ў форме сяброўскай бяседы з ужываннем чырвонага і белага віна. А на падвойную прэзентацыю свайго творчага набытку „бенефіцыянты" — Юры Гумянюк і Святлана Курс — пайшлі з чыста практычных мэтаў, каб „адстраляцца", як яны выславіліся, напярэдадні Калядных і Навагодніх святаў. Калі б іхныя кніжкі з'явіліся не напрыканцы лістапада, а месяцам раней, дык „бенефіцыянты" выступілі б перад вялікай аўдыторыяй аматараў прыгожага пісьменства, а не толькі блізкімі па духу калегамі ды журналістамі.

— Вядома, хацелася б правесці ў Мінску вечарыну кшталту тых, што ладзіліся ў 1990-х, але на яе арганізацыю проста не хапіла часу, — прызнаўся Юры Гумянюк. — Трэба было ўсё рабіць хутка, каб прабіць інфармацыйную блакаду, штучна створаную ў Гродне (відаць, па загадзе „зверху" ці па ўласнай дурнаце) мясцовымі газетамі. Гэта нават смешна, быццам выданне беларускай кнігі за межамі Беларусі стала такой ардынарнай і штодзённай падзеяй, што пра яе не варта змясціць у газеце пяць-шэсць радкоў! Мне асабіста тыя публікацыі непатрэбныя, але ж трэба паважаць чытача, які цікавіцца арыгінальнай беларускай культурай...

У Мінску калегі здзіўляюцца, што ў Гродне так „прыціскаюць і замоўчваюць" мясцовых літаратараў. Калі чытаеш гродзенскія газеты, дык ствараецца ўражанне, што ўсе больш-менш вядомыя і прыстойныя паэты, празаікі і публіцысты або павыміралі, або эмігравалі. Адзін толькі Юрка Голуб „свеціцца" ў выканкамаўскай „Гродзенскай праўдзе". Дый публікацыі пра культурнае жыццё Прынямоння зводзяцца збольшага чамусьці да асвятлення мастацкіх выставаў. Ну колькі можна пісаць пра тую задрыпаную выставачную залу абласнога аддзялення Саюза мастакоў, якую Гродзенскі гарвыканкам урэшце бярэ на свой баланс!

На думку ўдзельнікаў прэзентацыі ў Мінску (у дыскусіі прынялі ўдзел Адам Глёбус, Ігар Бабкоў, Кася Камоцкая, Алег Дашкевіч ды іншыя), беларускіх пісьменнікаў прыціскаюць, бо менавіта яны з'яўляюцца найбольш нацыянальна свядомай і патрыятычнай часткай творчай інтэлігенцыі, носьбітамі сапраўднай беларускасці. А яна аніяк не стасуецца з новай дзяржаўнай ідэалогіяй Беларусі, якая збольшага нагадвае савецкую прапаганду часоў СССР!

Не знайшлося б, напэўна, месца ў сучасным „дзяржвыдавецкім літаратурным свеце" і для свядомага „антыкамуніста і антысаветчыка" — польскага пісьменніка-эмігранта Густава Герлінга-Грудзінскага (1919-2000), апавяданні якога пераклала на беларускую мову Святлана Курс. Выданне гэтай кнігі сталася магчымым дзякуючы падтрымцы Central East European Book Projects ды Інстытута польскага ў Мінску. У прадмове Ян Максімюк піша: „Гэта выдатная літаратура, і я спадзяюся, што беларускі чытач атрымае сапраўдную асалоду ад гэтай першай — і будзем спадзявацца не апошняй — кніжкі Густава Герлінга-Грудзінскага па-беларуску. Я вельмі рады, што мне першаму выпаў гонар рэкамендаваць гэтага пісьменніка беларускай публіцы".

— Мае прыгоды з польскай мовай пачаліся, калі я працавала пакаёўкай у польскага гінеколага Каладзейчыка, — жартаўліва паведаміла перакладчыца Святлана Курс. — У гэтай кнізе змешчана шэсць самых маіх нелюбімых апавяданняў Густава Герлінга-Грудзінскага. Проста я чалавек іншага складу, чым гэты класік сучаснай польскай літаратуры, і захапляюся іншымі рэчамі. Аднак, без сумневу, гэта выдатны літаратар. Цікава, што я пачала займацца перакладамі ягоных твораў яшчэ пры жыцці самога аўтара. І ён, калі даведаўся, што яго апавяданні выйдуць па-беларуску, вельмі ўсцешыўся, бо меў даўні і вельмі своеасаблівы сантымент да Беларусі...

У польскага класіка былі не лепшыя ўспаміны пра Беларусь і СССР. І зразумела, бо на ягоны лёс, па словах Яна Максімюка, „моцны адбітак наклалі два таталітарызмы XX стагоддзя: камуністычны і фашыстоўскі". У сакавіку 1940 года Герлінг-Грудзінскі ў Гродне трапіў у рукі НКВД, і пасля побыту ў турмах Гродна, Віцебска і Волагды яго засудзілі на 5 гадоў лагера. Свой тэрмін ён адбываў у лагеры Ерцава ў Архангельскай вобласці. Але пасля двух гадоў турмаў і лагера яму ўдалося вызваліцца, бо перадваенным грамадзянам Польшчы ў ГУЛАГу, якія пажадалі ўступіць у польскую армію генерала Уладзіслава Андэрса, што арганізоўвалася тады ў СССР, аб'явілі ў 1942 годзе амністыю. Разам з арміяй Андэрса Герлінг-Грудзінскі эвакуіраваўся на Блізкі Усход, потым удзельнічаў у баях з гітлераўскімі войскамі ў Італіі. За мужнасць, праяўленую ў бітве за гару з кляштарам Монтэ-Касіна, быў адзначаны найвышэйшым ордэнам польскага войска — Virtuti Militari.

У 1952 годзе ў перакладзе на англійскую мову і з прадмовай славутага брытанскага філосафа Бэртранда Расэла выйшаў найбольш вядомы твор Густава Герлінга-Грудзінскага — „Іншы свет. Запіскі савецкія", які быў перакладзены таксама і на іншыя замежныя мовы ды прынёс пісьменніку сусветную вядомасць. У Польшчы кніжка ўпершыню выйшла толькі ў 1989 годзе. Як піша ў прадмове Ян Максімюк, „«Іншы свет» — гэта высокамастацкі запіс пісьменнікавага досведу ў савецкіх турмах і лагеры, адна з першых кніжак пра ГУЛАГ у сусветнай літаратуры".

Перакладзеныя Святланай Курс творы ўзятыя з апошняй дэкады творчасці выбітнага пісьменніка, якая была даволі плённай. На схіле жыцця Герлінг-Грудзінскі большую ўвагу аддаваў фабулярнай творчасці, чымся назіранням за палітычнымі пераўтварэннямі посттаталітарнае эпохі...

Думаецца, пасля выступлення ў сядзібе Беларускага ПЭН-цэнтра, і аўтар паэтычнага зборніка „Вуліца тыгровых архідэяў" Юры Гумянюк, і перакладчыца кнігі апавяданняў Густава Герлінга-Грудзінскага „Наш брат — Зло" Святлана Курс не абмяжуюцца адной-дзвюма прэзентацыямі, а сустрэнуцца з чытачамі і ў 2004 годзе.

Зміцер Руткоўскі

Інакш губляем усю красу!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аляксандра Шавэла



Віктар Швед

Чуллівы і сардэчны падарунак Супрасльскай Божай Маці прыносяць паэты — Аляксандра Шавэла, аўтарка нізкі лірыкаў „Супрасльскай душы пяянне" і Віктар Швед, які пераклаў іх на беларускую мову. Польска-беларускае выданне — дар на адбудову Супрасльскага манастыра. Багародзічная паэзія цудоўна ўпісалася ў калядны настрой і такі менавіта характар прэзентацыі прыдумалі аўтары.

Сустрэчу ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку (12 снежня 2003 г.) удастоіў архімандрыт Герман з Сафроніева ва Украіне. Госць захапіў чыстай беларушчынай ды заахвочваў святкаваць Каляды паводле старога стылю.

— Інакш мы губляем усю красу, — сказаў.

* * *

У настрой духовай прыгажосці ўвяла Аляксандра Шавэла, якая прачытала адабраныя вершы, а пасля яе голас узяў Віктар Швед:

— Я захапіўся імі ды хачу сказаць, што ў час, калі я працаваў над перакладамі, навучыўся працаваць на камп'ютэры (публіка апладзіравала).

— Пераклад мне падабаецца больш за арыгінал, — адзначыла паэтка, якая піша на польскай мове, а яе карані ў праваслаўнай сям'і на Валыні. — Паслухайма гімн да Супрасльскай Маці: *Бела-блакітная/ светлатварая/ спазірае на нас/ і з Твайго аблічча/ ззяе ўсцяж бляск/ спакою/ турботы/ колькі ж ў ім матчынай любві/ ахінаючай нас/ у малітве.../колькі ж галоў/ схіляецца ў пакоры/ прад Тваёй Іконай/ Бледнатварая/ вызнаваючы Табе/ свае смуткі.../ а Ты/ Нябесная наша маці/ адказваеш.../ Май мір ў сэрцы/ хай табе шчасціць Бог!*

Сугучны каляднаму настрою быў і нарыс айца Рыгора Сасны (замест уступу), які кінуў святло на крыніцы культу.

На пачатку існавання Супрасльскага манастыра ў царкве Дабравешчання Прасвятой Дзевы Марыі знаходзілася ікона Божай Маці — копія Смаленскай Іконы Божай Маці. Ікону ахвяраваў заснавальнік царквы, епіскап Язэп Солтан. Гэтая ікона ўяўляла тып Адзігітрыі, інакш шляхаводніцы. Божая Маці выступае ў палове постаці, трымае Дзіцятка на левай руцэ, указваючы на яго правай. Дзіцятка трымае скрутак, правая далонь Хрыста складзена ў жэст блаславення, таму што прыйшоў Ён на свет не асуджаць, а збаўляць.

Арыгінал загінуў у час бежанства, сучасная копія была напісана ў 1896 годзе для царквы Нараджэння Дзевы Марыі ў Донску. Культ іконы на працягу стагоддзяў садзейнічаў мастацкім і літаратурным з'явам — як славутыя фрэскі Нектарыя або Супрасльскі Ірмалагіён.

* * *

— Сёлета калядная радасць у манастыры не будзе лёгкай, — адзначыў супрасльскі архімандрыт Гаўрыіл. — Зноў голас узялі фанатыкі і ворагі адраджэння праваслаўя.

Гаварыў ён пра вяртанне канфлікту вакол катакомбаў. У мясцовым касцёле былі сабраны подпісы супраць перадачы катакомбаў манастыру.

— Але нам трэба выходзіць насустрач там, дзе няма міласці, — сказаў, не скрываючы болю і смутку а. Гаўрыіл.

Пакуль што, ключы да грабніц — у руках манахаў.

Архімандрыт расказаў пра вынікі археалагічных доследаў у катакомбах. Навуковыя доказы адназначныя, косці памерлых складзены паводле грэчаскай абраднасці. Галовы пакойнікаў спачывалі на цэгле, як на Гары Афон. Зараз астанкі перапахаваны — пакояцца яны пад крыжам на дзядзінцы манастыра.

Сваё выступленне архімандрыт закончыў надзейнай інфармацыяй. Пад канец мінулага года ў манастырскім будынку ўстаўлены новыя вокны.

* * *

Духовы апякун кніжкі, архімандрыт Гаўрыіл, адзначыў таксама беларускую традыцыю пісьменнасці.

— Супрасльскія манахі, — піша ён у зборніку, — мелі вялікі ўплыў на ўтрыманне праваслаўнай веры і старабеларускай мовы на Беласточчыне. Аж да Берасцейскай уніі Супрасльскі манастыр быў галоўным культурна-рэлігійным асяродкам нашай Царквы, а таксама калыскай нашай тоеснасці.

Незвычайнасць сустрэчы і ў тым, што двух архімандрытаў гаварылі пабеларуску, за што атрымалі ад публікі вялікія бравы.

— Я ўсё жыццё маліўся святому мучаніку Гаўрыілу, — прызнаўся архімандрыт Герман, — каб убачыць яго Радзіму. І вось, мае малітвы былі выслуханы, усё здзейснілася. Я прыехаў і пакланіўся яго грабніцы. А ў сераду, калі ў Супраслі пачалі служыць акафіст Божай Маці — я анямеў. Я дзякаваў Богу і Царыцы Нябеснай за цуд!

Манастыр Нараджэння Прасвятой Дзевы Марыі на ўсходзе Украіны, блізка мяжы з Расіяй. Айцец Герман служыць у ім з 80-х гадоў. Сам ён родам з Міжэвіч пад Слонімам.

— Не пакідайце нашай традыцыі, — папрасіў архімандрыт. — Святкуйце паводле старога стылю. Бо былі ўжо многія знакі, калі Бог пакараў за адыход ад закону.

Пасля, калі ўдзельнікі таўпіліся каля архімандрытаў па блаславенне, айцец Герман дорыў кожнаму словы суцяшэння. Калі даведаўся, што я з „Нівы", узрушыўся ды перадаў найлепшыя пажаданні на Каляды.

— Трымайцеся старога стылю, — паўтараў. — Бо ў ім уся Божая краса!

Ганна Кандрацюк

Дзед і баба з Тысячагоддзя

Прыехаў Пракоп з вёскі да дачкі. Дачок у яго чатыры, тры замужам, і сын на вёсцы, кавалер. Беластоцкая дачка патрымала яго два дні, але што старому рабіць — увесь час хата пустая, унукі ў школе, дачка на працы... Зараз і цямнее... Рашыў Пракоп знайсці занятак. Перш за ўсё знайсці цёплую кабету, бо ж халады ідуць. Першую падчапіў пад крамай саракагадовую выкладчыцу матэматыкі. Нічога, што ён сам з 1935, але выгляд у яго някепскі яшчэ, чупрына, хоць сівая, усё ж буйная, на амаль што юнацкім, румяным твары ледзь прыкмеціш змаршчыну. А калі цемнавата, дык увогуле ён маладжавы, стройны дзядзька...

Ніяк Пракопава жвавасць не спадабалася высокай вучонай маладзіцы. Але завяла яго ў госці да сваёй знаёмай — удавы. Бо ж не адчапілася б. Паглядзеў Пракоп на Тарэску, Тарэска на Пракопа, і спадабаліся адно аднаму. І слоў не трэба было многа. Пайшоў Пракоп да дачкі, спакаваў чамадан, ключ паклаў пад дзвярыма пад анучку і без слова пайшоў да новапазнанай удавы. Жыць.

Што вы кажаце, няма якіх жарсцяў у старэйшых?! А колькі вам гадоў самім будзе? Кожны хоча кахаць, любіць, не быць адным як палец. А кроў — не вада, пакуль плыве ў венах, яна, было ні было, мае тэмпературу не меншую чым 37 градусаў. Нават у тых, пра каго гавораць, што ў яго „гарачая кроў" — яна не цяплей гэтых градусаў, хіба што ён хворы. А хто закаханы здаровы? Тады ў арганізме праходзяць такія працэсы, хімічныя і фізічныя, на якіх знаюцца фізіёлагі і іншыя хімікі-фізікі, а чытач не мусіць, а тым больш я не буду тлумачыць, што рабілася ў сэрцы Тарэсы і Пракопа, якім Бог даў сустрэцца. Бо хто ж іншы тузае за ніткі лёсу, хіба ж не нейкія міфічныя паркі? Ды каму там з нас да спраў суседзяў? Хай кожны робіць, што заўгодна, за сваімі сценамі. Не, чытач хоча ведаць, што робіцца. Вядома, калі цікава і варта пачытаць. А калі цікава? Кажуць, труп ажыўляе газету.

Ды не, не так адразу! Чаго вы хочаце, займайцеся сваімі плёткамі! Няма чаго смяяцца са старых, што ходзяць за ручку па раёне, бы якія закаханыя малалеткі. І няма чаго чакаць сенсацыі! Справу адобрылі Пракопавы дзеці — маюць бацька і дзед занятак, не ходзіць зачаста ў госці. Пенсіі старых, калі браць іх дзве, дазваляюць нават штосьці адкласці ўнукам. І на лякарствы, здаецца, хапае, тым больш, што быццам бы паздаравелі старыя. Але не вельмі спадабалася тое, што ў маці кавалер, да таго „рускі", Тэрэсіным дочкам. „Хто то бачыў, на старасць жыць у граху?" — крычала Яўлалія, старэйшая дачка Тарэсы, а яшчэ больш узлавалася, калі маці сказала, што, каб не жыць у гэтым граху, дык возьмуць шлюб. Хата ж яшчэ не апісана на ўнука. А тут яшчэ і новы нарадзіўся... Баба сваё аджыла, дык павінна думаць толькі аб тым, што пакінуць па сабе, бо ж не забярэш усяго ў магілу. Што, бабульцы яшчэ жыць хочацца? Цьфу!

Сталі рыхтаваць хрэсьбіны малога. Пайшла бабуля ў адведкі, Яўлалія патлумачыла ёй дакладна: будзеш са старым — не прыходзь. Маркотная Тарэса сядзела ў хаце, не азывалася да каханага Пракопа. А Пракоп пайшоў у краму „Сполэм" па вуліцы Вясёлай, накупіў гарэлкі.

— Ну, калі не трэба, дык хрысціны зробім самі.

Пракоп піў, піў, аж зрабілася яму блага. Даўно не піў столькі, тым больш, бо ж Тарэса адразу зазначыла, што не любіць, каб мужык у чарку зачаста заглядваў.

— Ты хоць зрабіла б закуску!

— Сам вазьмі, п'янюга!

Пракоп пайшоў да халадзільніка, дастаў кумпяк, гуркі. Ледзь данёс на стол. Тарэса глядзела на яго нейкімі чужымі вачыма.

— Пі, пі! Цяпер бачу, які ты! Хаваўся столькі часу! От знайшла сабе каханка! Праз цябе ўнука не маю! Сям'я ад мяне адраклася! Каб хоць мужам быў!..

— Калі б ты была мая жонка, то прынесла б вастрэйшы нож, нарэзала б, накарміла чалавека...

— А за што яго карміць! Якая з яго карысць? Калі б малады быў! — Тарэса наліла шклянку гарэлкі і выпіла са слязамі ў вачах.

— О-то-то! Знайшлі маладзіцу! Старая торба! Выйдзеш на вуліцу — маладых не перабярэш! А то ўклякнуўся ў рашапэту! Адно доіш мяне з пенсіі!!!

Тарэса схапіла нож. Трапіў ён паміж рэбры каханага Пракопа.

Лукаш Правасуд

Дзяцінства заварожанае хвалямі (2)

(працяг; пачатак у 50 нумары)

Новая хата

Карпатлівае было тое лета, а на мяне мала хто і ўвагу звяртаў. Галоўнае было, каб я не хадзіў туды, дзе было забаронена. На другі год толькі павёў мяне бацька, каб паказаць новую хату. Была яна зробленая з новых, пахучых смалой бярвенняў, між якімі мох тырчэў. Ні ў хаце, ні ў сенях не было падлогі (так яно і засталося назаўсёды). Свая хата мне спадабалася, толькі вакол яе — так як і на ўсіх амаль хутарах — было пустое, без аднаго нават дрэўца, поле. Праўда, воддаль расла ляшчына, якая давала штогод багата арэхаў. І па ўсім „доўгім" балоце, якога частка была бацькава, раслі кусты алешніку.

Раней мы жылі з дзядзькамі цераз сені. (А было іх тры мужчыны — браты бацькі — і дзве сястры). Цяпер дзядзькі свой дом будавалі. Іхны хутар нават часткова межаваў з нашым. Дом меў быць на два канцы. Вакол большага панадворка стаялі вянцом: хлявы, вазоўня, свіран. Дзве пуні стаялі крыху воддаль. На панадворку пільшчыкі на высокіх казлах рэзалі бервяно на дошкі. А яшчэ будавалася кузня і рыхтавалася пабудова лазні. І на двары, і ў хаце ляжалі гурбы пахучых трэсак. Было цікава. Колькі ж тут будынкаў, колькі месца, дзе можна схавацца.

На хутар, у новую хату мы перабраліся неўзабаве. І на нашым панадворку нанятыя людзі ставілі хлеў і пуню. Бацька меў сваю карову, якой мне трэба было аберагацца, каб не папасці ёй на рогі, бо не любіла дзяцей. Потым бацька купіў двое парасят, з якімі карова падружыла і без іх ані ў хляве, ані на полі аставацца не хацела. Новае месца з кожным днём мне ўсё больш падабалася, было цудоўна.

Першая сустрэча з Доўгім возерам

Хаты на хутарах стаялі адна ад другой дастаткова далёка і таму тут было намнога спакайней чым у вёсцы. Але на новым месцы кожнаму трэба было прывыкаць да новых умоў і абставін жыцця. Я са сваім хутарам пазнаёміўся вельмі хутка. Ніхто мне ў гэтым не рабіў ніякіх перашкод. Але мне дужа ж хацелася пазнаёміцца і з усім тым, што было на дзядзькавым хутары, хаця б і на самым панадворку, або ў вазоўні, дзе дзядзька Болісь ладзіў сталярскую майстэрню. Там маглі быць розныя кавалкі дошак, кубікаў — цацак для гульні. І раз бацька дазволіў пайсці мне туды самому. Я пабег. Ледзь апынуўся на дзядзькавым панадворку, а там цётка Антаніна, пабачыўшы мяне, загадала, каб пабег за гару і паклікаў мужчын на абед. Яны там недзе церабілі зараснік, або кусты карчавалі. Ну і пусціўся я бягом з горкі. Не прыкмеціў, дзе быў той зараснік, пра загад забыўся. А калі з разгону па касагоры апынуўся на лузе, убачыў нейкія водблескі, што мільгаюць праз кусты. Са здзіўленнем уцяміў, што там вада, што гэта хвалі блішчаць на сонейку. Асцярожна выйшаў праз кусты на бераг. На беразе быў жоўценькі пясочак, а хваля знянацку накацілася на мае босыя ногі, аблізала іх і вярнулася, знікаючы лагодна ў водмелі возера. За хвілінку накацілася другая хваля, трэцяя. З плёскам і шопатам разліліся яны ўздоўж берага. Здавалася, што хвалі беглі аж з другога возера, з таго берага, які быў быццам далёка, далёка. Хвалі прыплывалі ўсё новыя і новыя, безупынна плёскалі, нешта шапталі і з шумам вярталіся ў возера. Здалося, што ўсё возера калышацца і я з ім. Гэты від заварожыў мяне — я ж упершыню „самастойна" спатыкаюся з возерам. І то яшчэ з новым, дагэтуль мне невядомым і такім вялікім.

„Ты, маліц, глухі, ці што? Заву, заву, а ты быццам урос у гэты гэты бераг", — пачуў я голас дзядзькі Бронькі. Мне нават галава закружылася ад усіх сягоняшніх нечаканасцей. Кажу: „Дзядзечка, хвалі тут так крэпка шэпчуць". „Шэпчуць, шэпчуць, — перабівае мне дзядзька, — а я нават ведаю, што яны шэпчуць. Лупцоўку табе бацька справіць, што лётаеш як з ланцуга сарваўшыся, ды яшчэ ў возера лезеш". Я пачаў апраўдвацца, што я нічога не знаў пра гэтае возера. „Я таксама не ведаў, што цябе на вяроўцы нада было прывязаць у панадворку" ужо з усмешкай сказаў дзядзька, а я адчуў глыбокую палёгку на душы. Ноччу нават яны мне сніліся, тыя хвалі і берагі, якія невядома дзе пачыналіся і дзе канчаліся. І сапраўды, што было за возерам? Я ўбачыў толькі лес. А што за лесам? Такія пытанні пачалі мяне праследаваць толькі цяпер, калі пабачыў новае возера. Бацька мне сказаў, што гэта Доўгае возера. А за ім і вёска ёсць, што завецца таксама Доўгае. Насупраць Абрубскіх хутароў ляжаць Каменкі на ўзгорку, а над возерам там расце лес. Зрэшты, „сам некалі пабачыш".

Новае месца жыцця мне спадабалася. Ды і вяскоўцы хутары хвалілі. Кожная хата адна ад другой былі далёка, кожны гаспадар меў зямлю кругом хаты, а не як раней у шнурках-палосках, якія цягнуліся вузенькія ад возера да возера. Праўда, будавацца было цяжка, нялёгка было падымаць аблогі, або кусты карчаваць, каму яны дасталіся. Кусты раслі над Доўгім возерам. Каля возера хацелі жыць перш за ўсё рыбаловы. Вось і пасяліліся ўздоўж Доўгага возера — пачынаючы ад Зябак, Андрэй Чарняўскі (мамін брат), Юстын Малько, мае дзядзькі, Іван Малько, Сцёпка Беглік і Юлісь Беглік. (Далей ужо была вёска Драчына). Прыгожа было раніцай, улетку. Сонейка ўставала з-за лесу над возерам. Калі над возерам, бывала, вісеў густы туман, дык нават лесу не было відаць за ім. Толькі другая талерка паказвалася скрозь туман, а на ёй рысаваліся часам вяршкі елак або сосен. Калі прыгадваю тыя часіны, міжвольна пачынае гучэць у вушах цудоўны верш Івана Нікіцюка „Утро". Якія ж прыгожыя вершы пісалі пра свае радзімы чужыя паэты. І чаму так мала нам даступна захапляцца родным словам пра прыгажосць роднага...

Сярод тых, хто пасяліўся каля Доўгага возера, найбольш заўзятым рыбаловам быў, бадай, дзядзька Юстын Малько. Ён, калі ўжо ставіў хату на хутары, то на панадворку выкапаў глыбока ў зямлі катлаван, збудаваў ёмісты склеп з саламянай страхой, а ўнутры, па абодвух баках засекі, у якія зімой клалі нарэзаны на возеры лёд. У гэтым склепе можна было ўлетку трымаць свежую рыбу. Вядома, цётка Матрона трымала там і свае кухонныя прадукты. А туды без кажуха ўвайці было рызыкоўна — там круглы год панаваў мароз.

Дзядзька Юстын меў лодку. Сам рабіў сеткі — нават мяне вучыў вязаць „вочкі". Сам праў ніткі на калаўроце, сам сукаў — скручваў ніткі ўдвая. Рабіў гэта часам пры акне, у святле месяца. Рыбалоўства некаторыя абрубцы лічылі сур'ёзным заняткам. Здаралася, што ездзілі лавіць рыбу ці ракаў у іншыя, далёкія азёры, каб злоўлены запас пусціць у Доўгае возера. Я любіў глядзець як лавілі рыбу невадам узімку. Рабілі вялікую „пролубку", накручвалі на „бабы" — вялікія бочкі — вяроўкі з-пад лёду, а я ніяк не мог уцяміць, як тыя вяроўкі пад лёдам апынуліся. Калі пытаўся, смяяліся: „Калі будзеш рыбаком — скажам, не будзеш, то не". Але мне трэба было расці. Вудачку я ўжо меў. Мішка Іванаў з конскага валосся сплёў — кручок у Ханкі ў Псуі за яйка купіць было можна. Але раз, калі шукаў у трысніку шыцікаў, хваля вуду забрала, адплыла яна далёка на возера і тым кончылася мая кар'ера рыбалова. Затое, цыраваць дзіркі ў сетках ахвотна дапамагаў. Летам, калі сеткі сушыліся на сонейку, ад іх ішоў моцны пах рыбы. Аказалася, што і сеткі, і рыба вадой пахнуць. Словам, чалавек жывучы вучыцца.

(працяг будзе)

Анатоль Маўчун

Гэта было пад Кёнігсбергам (2)

Расказвае Марфа РАМАНЧУК, жыхарка Кузавы Чаромхаўскай гміны.

(працяг; пачатак у 50 нумары)

Гаспадары акуратна да мяне ставіліся. Тры разы ў дзень добра кармілі. Летам другое снеданне і падвячорак давалі. Малако і смятану можна было піць удосталь. Пад канец службы шэсцьдзесят кілаграмаў важыла.

Жывёлу пасвілі непадалёк дома на 5-гектарным парослым буйнай травой і елкамі тарфяніку. Летам капалі і сушылі торф, які зімой на апал выкарыстоўвалі. Дровамі печ палілі, калі хлеб пяклі.

Атрымала я пасылку з дому. Франц з пошты забіраў. Матуля бохан іржанога хлеба паслала ды ў ім кусок сала запякла. Гаспадар, як пабачыў гэта, дык здзівавацца не мог, што хлеб такі чорны спажываем. На від сала ўсміхнуўся. „Гут, шпэк, Марта...", — сказаў. На другі дзень Агата пячэнне спякла і сказала бацькам гасцінец паслаць. З надыходам фронту на акопы пад Кёнігсберг забралі. Вёска чатырнаццаць кіламетраў ад маёнтку знаходзілася. Пры ад'ездзе Агата плед і падушку дала. Закватаравалі нас у бараку. Адна руіна. Здавалася, што заваліцца ад мацнейшага ветру. Спалі ў адзенні на шмат'ярусных ложках. Дошкі адно саломай прыкрыты. Мне лепш было, бо мела свой плед і падушку. Кармілі кепска. Сто грам маргарыну, такая ж порцыя каўбасы і паўкілаграмавы кавалак хлеба на тры дні прызначалі. Людзі ад голаду паміралі. Трупы штодзень вывозілі. Пазней брукву варылі і такую поліўку давалі. Сем тыдняў на акопах была. Цяжка працавала. Два метры ўглыб капалі і шэсць у шырыню. Як рускі самалёт прыляцеў, немцы ўраспалох кінуліся. Паляцела ў след кулямётная чарга. Ніхто не пацярпеў. Іншым разам лістоўкі скідалі. Немцы не дазвалялі іх чытаць. Хлопцы хавалі за адзенне. Пасля ў бараку чыталі. З падыходам фронту ахова лепш адносілася. На чацвёрты дзень, як лістоўкі скідалі, над логавам залегла цішыня. На работу не выганялі. Вартоўня пуставала. Сабралася затым у маёнтак вярнуцца. Стаяла халоднае надвор'е. Першыя замаразкі прадвяшчалі зіму. Затым дамоў прышлёпала, дык ногі замарозіла. У хаце Агата вады нагрэла. Ногі загадала выпарыць. Пасля парашком перасыпала. Дзве пары суконных шкарпэткаў дала і Францавы боты. Ад паненкі я даведалася, што брата на фронт забралі. На работу прыняла Міхала, які раней у суседзяў на калёніі працаваў.

Праз дзень жандары прыехалі. Сказалі на акопы вяртацца. Гаспадыня прасіла, каб пакінулі, бо ногі адмарожаны. Не паслухалі. Калі намякнула, каб падвязлі, дык сказалі: „Як прыйшла, так няхай вяртаецца". Гэтым разам бліжэй Кёнігсберга ставілі лінію абароны. Грукат гарматніх выстралаў прыбліжаўся і ўзмацняўся. Авіяцыя рабіла налёты. З напрамку Гутштат падавалася на захад руская армія. Шмат тэхнікі праходзіла шашою. Хлопцы гаварылі, што не прыдаліся акопы, якія мы капалі. Немцы адступалі. Нас пакідалі на волю лёсу. Пасля двухтыднёвай няволі вяртаюся да гаспадароў. Дзяўчына з Зубачоў хацела ісці разам, але я адмовіла яе. Да чужых не адважылася забраць.

На панадворку стаялі санкі падрыхтаваныя для дарогі. На фуры Агата з бацькамі сядзелі. Міхал коньмі кіраваў. Як мяне ўбачылі, дык прапанавалі разам ехаць. — „Рускія расстраляюць", — тлумачыла паненка. Адмовілася. Пасля ад'езду гаспадароў адна засталася. Страшна стала. Да поўдня жывёлай займалася. Затым да суседзяў хадзіла. Хведар Мартыновіч з Орлі выходзіў. Два гады як на хутары з сям'ёй пасяліўся. Не па сваёй волі. Жыццё такі лёс падарыла.

Федзя быў музыкантам. Спадабаў дзяўчыну. Жаніцца задумаў. Бацькі супраціўляліся. Таня з беднай сям'і выходзіла. Каханне перамагло. Праз год сынок нарадзіўся. Коляй назвалі. У Нямеччыну назначаны быў Федзін малодшы брат. Бацька задумаў маладое сужонства разбіць. Пахадайнічаў, каб старэйшага забралі. Хведар не супраціўляўся. Затое жонка сказала: „Адны не застанемся. З табою паедзем". Узялі з сабою гармонік, каб долю на чужыне павесяліць.

Атрымалі сямейную кватэру. Дом Мартыновічаў сумежаваў з гаспадаркай Францаў і Агаты. Штодзень сустракалася я з суседзямі. Таню старэйшай сястрой лічыла. Як гаспадары нашы выехалі, дык дом Мартыновічаў стаў зборам для ўсіх на хутары. Каля шасцідзесяці людзей збіралася. Неаднойчы на начлег заставала. Спалі на пасланай на падлозе саломе. Прадуктаў хапала, бо немцы пакінулі запасы.

(працяг будзе)

Запісаў Уладзімір Сідарук

Мікалай Лук'янюк

Пажаданні

Пажаданні з Новым годам
Усяму я шлю народу,
Каб шчасліва пражывалі,
Пра здароўе сваё дбалі,
Каб у гэтым тысячалецці
Не было вайны на свеце.
За гэта трэба маліцца,
Ды нізка Богу пакланіцца.
Памаліцеся й за ўладу,
Што сабе дбае пра выгоду —
Каб і людзей шанавалі,
Трошачкі пра іх падбалі.
Ну і каб на гэтым свеце
Жылі ляпей унукі й дзеці,
Беспрацоўя каб не зналі,
А працу годна шанавалі.
Каб усім ляпей жылося —
Таго ў Госпада папросім,
Каб навёў усіх на дарогу,
На калені станем перад Богам.
Я таго ўсім жадаю:
Каб жылі як у Божым раю,
Гора ды бяды не зналі,
А ўсе шчасліва пражывалі!

Вучацца гаспадарчай дзейнасці

Фота МАРЫЮША ГАРУСТОВІЧА

У курсах прынялі ўдзел жыхары Гайнаўшчыны

Фонд успамагання вёсак, Банкавы фонд імя Леапольда Кроненберга і Павятовае староства ў Гайнаўцы рыхтуюць жыхароў Гайнаўскага павета да вядзення гаспадарчай дзейнасці. З 11 па 13 і ад 17 да 19 снежня 2003 года жыхары Гайнаўшчыны вучыліся на курсах: „Вядзенне агратурыстычнай дзейнасці". У дзвюх групах займалася амаль 60 асоб. Некаторыя курсанты вядуць ужо агратурыстычную дзейнасць і намерваюцца яе развіваць з дапамогай праграмы SAPARD. Каб атрымаць з праграмы SAPARD зварот 50% інвестыцыйных коштаў, трэба быць уласнікам прынамсі аднаго гектара поля і весці сельскагаспадарчую дзейнасць. Удзельнікі курсаў знаёміліся з тэарэтычнымі ведамі наконт прыстасавання кватэр да гасцінічных умоў, прымання турыстаў, наведалі агратурыстычныя кватэры ў Лазіцах, Савіным Грудзе і Белавежы. Некаторыя гайнавяне рашыліся выкарыстаць у агратурыстычных мэтах старыя вясковыя бацькоўскія хаты. Важныя для іх веды па маркетынгу і рэкламе паслуг.

— Выкладчыкі знаёмілі курсантаў, як весці размовы па тэлефоне і прэзентаваць агратурыстычныя паслугі для гасцей, якія хочуць першы раз затрымацца. Вучоба закончылася экскурсіяй у агратурыстычныя кватэры, каб можна было на практыцы ўбачыць як прымяняюцца тэарэтычныя веды, — заявіў Марыюш Гарустовіч з Павятовага староства ў Гайнаўцы. — Адкрыццё агратурыстычнай дзейнасці спрычыняецца да гаспадарчай актывізацыі суседзяў агратурыстычных кватэр. Турысты, якія прыязджаюць на начлег, часта хочуць наняць веласіпеды, пакатацца на конях, брычках або паплаваць на байдарках, што спрычыняецца да ўзнікнення новых паслуг і дадатковых месцаў працы.

Марыя Ляплятэ, старшыня Вармінска-Мазурскага агратурыстычнага саюза, якая вяла заняткі з курсантамі паінфармавала, што ўласнікі вясковых кватэр многа ўвагі адводзяць падрыхтоўцы дамоў для гасцінічнай дзейнасці, а забываюць пра дэталі, якія вырашаюць ці турысты захочуць застацца ў іх. Гэтыя дэталі — прыбіранне пакояў згодна з мясцовымі традыцыямі і традыцыйныя стравы. Турыстам, якія наведваюць Гайнаўшчыну, вельмі смакуюць бульбяныя стравы. Сабраныя пазнаёміліся з праграмай невялікіх крэдытаў, якую рэалізуе Фонд успамагання вёсак.

11 і 19 лістапада 2003 года Павятовае староства ў Гайнаўцы праводзіла курсы па прынцыпах карыстання праграмай SAPARD. Прынялі ў іх удзел больш за 100 асоб, у тым ліку земляробы, прадпрымальнікі, прадстаўнікі арганізацый і мясцовых самаўрадаў. Грошы з праграмы SAPARD (50% коштаў інвестыцый) можна атрымаць, пасля заканчэння работ, на стварэнне дадатковых крыніц даходаў у сельскай гаспадарцы, месцаў працы па-за сельскай гаспадаркай і інфраструктуры на вясковых тэрыторыях. Каб атрымаць сродкі з гэтай праграмы, трэба падрыхтаваць адпаведныя дакументы і дастасавацца да шматлікіх патрабаванняў. Марыюш Гарустовіч паінфармаваў, што некаторыя ўдзельнікі курсаў выступілі індывідуальна або ад сваіх устаноў за ўспамогай з праграмы SAPARD. Павятовае староства ў Гайнаўцы запланавала ў пачатку 2004 года чарговыя падобныя курсы.

Аляксей Мароз

Гайнаўка прыгажэе

Восенню мінулага года ў Гайнаўцы адрамантавалі і затым паклалі асфальт на вуліцах Падмейскай і Папярочнай. Пры рамонце дапамагалі жыхары гэтых вуліц.

Новай маставой карыстаюцца, між іншым, жыхары дамоў па вуліцах Аддаленай, Заячай, Цюльпанавай і Ружавай.

Напрыканцы снежня 2003 года каталіцкі найбольшы касцёл у цэнтры горада па вуліцы 3 Мая ды праваслаўны Святатроіцкі сабор па вуліцы Антона Дзевятоўскага атрымалі ілюмінацыю. (яц)

Як мінуў год?

З такім пытаннем звяртаўся я да сваіх суразмоўцаў. Вось што гаварылі:

Лявон С. — чаромхаўскі прадпрымальнік: Каб наступны не быў горшы. Для людзей бізнесу праблема — казначэйская ўстанова. ПІТ — сапраўдная галаваломка. А ёсць іх шмат. Ды падаткі надта высокія. План міністра Гаўзнера, па-мойму нічога не адменіць. У перыядзе больш дзесяцігадовай трансфармацыі і рыначнай эканомікі адно гаворыцца, што даецца зялёнае святло для малых і сярэдніх прадпрыемстваў. У сапраўднасці маем чырвонае святло. І з кожным днём стаецца яно больш рэзкім.

Мікалай Ш. — прадпрымальнік з Нурца: Вымушаны ліквідаваць фірму. На дарма'едаў працаваць не стану. Вясною збіраюся паехаць у Францыю. Брат, напрыклад, паехаў на месячны водпуск у Альпы і зарабіў немалыя грошы. Пахадайнічаю за працай. Лічу, што пашчаслівіцца...

Міхал Врублеўскі — войт Чаромхаўскай гміны: У 2003 годзе многае зрабілася, улічваючы надта сціплы гмінны бюджэт. Праблема з даўжнікамі. У асноўным, з чыгункай. Вінавата яна 399 тыс. злотых. Гэта вельмі многа. За гэтыя грошы маглі б палажыць асфальт на дзвюх вуліцах. На чыгуначныя фірмы нельга паўплываць, каб плацілі падаткі. Прадпрыемства маёмасці ў Беластоку, напрыклад, прадало даўнейшую амбулаторыю за 80 тыс. зл. і лазню за палову гэтай цаны. Узялі 120 тыс. Каб хоць палову сумы адкінулі на даўгі. Ні залатоўкі! У гэтым годзе нічога, пэўна, не адменіцца. Устанаўляючы сёлетні бюджэт Рада гміны зноў запіша на баку прыбыткаў суму з падаткаў ад маёмасці, у рэчаіснасці ў цячэнні года вымушаны будзем уводзіць карэктуру, паколькі грошы з падаткаў не прыйдуць у гмінную касу. Але выхад з тупіку вымушаны будзем знайсці.

Запісаў Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЕВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Накład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Prenumerata „Niwy" w redakcji
Cena 1 egzemplarza
wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45
(kwartalnie – 44,85)

styczeń 2004 13,80
luty 2004 17,25
marzec 2004 13,80

Prenumerata „Niwy" w redakcji
Cena 1 egzemplarza
wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45
(kwartalnie – 44,85)

styczeń 2004 13,80
luty 2004 17,25
marzec 2004 13,80

Prenumerata „Niwy" w redakcji
Cena 1 egzemplarza
wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45
(kwartalnie – 44,85)

styczeń 2004 13,80
luty 2004 17,25
marzec 2004 13,80

Prenumerata „Niwy" w redakcji
Cena 1 egzemplarza
wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45
(kwartalnie – 44,85)

styczeń 2004 13,80
luty 2004 17,25
marzec 2004 13,80

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Анкета

Запрашаем Чытачоў прыняць удзел у анкеце, якая дапаможа нам лепш пазнаць Вашы зацікаўленні і дастасаваць да іх наш тыднёвік. Чытачы, якія запоўняць анкету і дашлюць яе да 8 лютага ў нашу рэдакцыю, прымуць удзел у жараб'ёўцы кніжак і кампакт-дыскаў з беларускімі песнямі.

Хто нас чытае?

Узрост
- ❑ да 25 гадоў
- ❑ 26-30 гадоў
- ❑ 31-35 гадоў
- ❑ 36-45 гадоў
- ❑ 46-55 гадоў
- ❑ 56-65 гадоў
- ❑ больш

Месца пражывання
- ❑ вёска
- ❑ гмінны цэнтр
- ❑ павятовы горад
- ❑ Беласток
- ❑ па-за межамі Беласточчыны

Адукацыя
- ❑ падставовая
- ❑ прафесійная
- ❑ сярэдняя
- ❑ ліцэнцыят
- ❑ вышэйшая

Прафесія
- ❑ вучань
- ❑ студэнт
- ❑ беспрацоўны
- ❑ рабочы
- ❑ земляроб
- ❑ навуковы работнік
- ❑ работнік дзярж. адміністрацыі
- ❑ канцылярскі работнік
- ❑ кіраўнічая пасада
- ❑ свабодная прафесія
- ❑ уласная дзейнасць
- ❑ пенсіянер
- ❑ іншая, якая: .....

.....

Зацікаўленні
- ❑ палітыка
- ❑ гісторыя
- ❑ цывілізацыя
- ❑ культура
- ❑ навука
- ❑ спорт
- ❑ бізнес і фінансы
- ❑ іншыя, якія: .....

.....

Як нас купляеце?

Як часта купляеце „Ніву"
- ❑ заўсёды
- ❑ некалькі разоў у год
- ❑ раз у год
- ❑ купіў толькі раз

У які спосаб атрымоўваеце „Ніву"
- ❑ падпіска ў школе
- ❑ падпіска ў „Руху"
- ❑ падпіска па пошце
- ❑ падпіска ў рэдакцыі
- ❑ купляю ў кіёску
- ❑ купляю на пошце
- ❑ купляю ў магазіне
- ❑ у бібліятэцы або чытальні
- ❑ атрымоўваю ад знаёмых
- ❑ чытаю інтэрнэтнае выданне
- ❑ іншы, які: .....

.....

Што схіліла Вас купіць „Ніву" ўпершыню?
- ❑ змест
- ❑ загаловак
- ❑ знаёмыя
- ❑ выпадак
- ❑ агляд „Нівы" па радыё
- ❑ іншае, што: .....

.....

.....

Што пра нас думаеце?

Ці „Ніва" прадстаўляе аб'ектыўны вобраз рэчаіснасці?
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ па меры аб'ектыўна
- ❑ па меры суб'ектыўна
- ❑ цяжка сказаць

Тыднёвік надта многа месца адводзіць
- ❑ палітыцы
- ❑ гісторыі
- ❑ цывілізацыі
- ❑ культуры
- ❑ навуцы
- ❑ рэлігіі
- ❑ дэбатам
- ❑ каментарыям
- ❑ іншым, якім: .....

.....

.....

.....

Тыднёвік надта мала месца адводзіць:
- ❑ палітыцы
- ❑ гісторыі
- ❑ цывілізацыі
- ❑ культуры
- ❑ навуцы
- ❑ рэлігіі
- ❑ дэбатам
- ❑ каментарыям
- ❑ іншым, якім: .....

.....

.....

.....

Як ацэньваеце першую старонку „Нівы"
- ❑ вельмі цікавая
- ❑ цікавая
- ❑ манатонная
- ❑ цяжка сказаць
- ❑ іншыя заўвагі

Самыя важныя каштоўнасці „Нівы"

.....

.....

.....

.....

Самыя важныя заганы „Нівы"

.....

.....

.....

.....

Рэклама

Ці звяртаеце ўвагу на рэкламу ў „Ніве"
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ рэдка
- ❑ ніколі
- ❑ цяжка сказаць

Ці рэклама ў „Ніве" схіліла Вас пакарыстацца прапановай
- ❑ часта
- ❑ часам
- ❑ ніколі
- ❑ цяжка сказаць

Ці лічыце, што ў „Ніве" павінна друкавацца рэклама
- ❑ так
- ❑ не
- ❑ цяжка сказаць

Прозвішча .....

Імя .....

Адрас .....

.....

.....

ba у падпісцы Hiba у падпісцы Hiba у падпісцы Hiba у падпісцы Hiba у падп

odcinek dla wpłacającego

zł ..... gr .....

słownie złotych

groszy jak wyżej

wpłacający .....

dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....

.....

Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504

Datownik

podpis przyjmującego

Opłata

zł .....

odcinek dla posiadacza rachunku

zł ..... gr .....

słownie złotych

groszy jak wyżej

wpłacający .....

dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....

.....

Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504

Datownik

podpis przyjmującego

Opłata

zł .....

odcinek dla poczty/ banku

zł ..... gr .....

słownie złotych

groszy jak wyżej

wpłacający .....

dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....

.....

Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504

Datownik

podpis przyjmującego

Opłata

zł .....

odcinek dla banku

zł ..... gr .....

słownie złotych

groszy jak wyżej

wpłacający .....

dokładny adres wraz z nr kodu poczt. .....

.....

Rada Programowa Tygodnika „Niwa"
Białystok, ul. Zamenhofa 27
BPH PBK SA Oddział w Białymstoku
77 1060 0076 0000 4011 5001 5504

Datownik

podpis przyjmującego

Opłata

zł .....